

З 1 ліпеня ў Мытным саюзе Расіі, Беларусі і Казахстана ўводзяцца ў дзеянне тэхнічныя рэгламенты на прадукцыю харчовай прамысловасці. Ці гатовы нашы прадпрыемствы да новых «правілаў гульні»? СТАР 2



Горад Быхаў актыўна рыхтуецца да правядзення Дня беларускага пісьменства. Галоўны аб'ект — старажытны замак. Гэта ўнікальны помнік мураванага дойлідства Беларусі. Ва ўсходняй Беларусі другога такога замка няма. СТАР 6



50 гадоў беларускія слухачы маглі слухаць голас аргана, які стаіць у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі. Юбілей інструмента вырашылі адзначыць цыклам канцэртаў у рамках «Мінскай вясны». СТАР 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 КРАСАВІКА 2013 г. АЎТОРАК № 65 (27430) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## САЦЫЯЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ БАНКА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў асноўныя палажэнні распрацоўваемай стратэгіі Банка развіцця Беларусі да 2015 года. Аб гэтым ішла размова 8 красавіка ў час даклада кіраўніку дзяржавы старшыні праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргея Румаса.**

Прэзідэнту далажана аб паказчыках работы банка, дзейнасці па фінансаванні дзяржаўных праграм, прыёмцы актываў з дзяржаўных банкаў. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка цікавіўся выкананнем даручэнняў, якія былі дадзены пры назначэнні Сяргея Румаса на пасаду кіраўніка банка.

Кіраўнік дзяржавы асобна спыніўся на сацыяльнай адказнасці банка як арганізацыі, якая працуе прыбыткова. Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што рэалізацыяй сацыяльных праектаў павінна займацца кожная буйная арганізацыя ў Беларусі, не толькі банк. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў Банку развіцця ўзяць для выканання праект «Школьны аўтобус», які прадугледжвае на працягу пяці гадоў поўнае вырашэнне праблемы з забеспячэннем сельскіх населеных пунктаў транспартам для падвозкі дзяцей у школу і назад. Ужо ў гэтым годзе банк прафінансуе куплю 60 аўтобусаў — па дзесяць для кожнай вобласці. Паводле слоў Сяргея Румаса, Банк развіцця падыдзе да гэтага пытання комплексна, арганізаваўшы таксама курсы вадзіцеляў гэтых аўтобусаў. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову, каб вадзіцелямі ў гэтым праекце былі выключна жанчыны, паколькі праблемы жаночай занятасці ў вёсцы стаяць асабліва востра і, акрамя таго, жанчыны як вадзіцелі значна больш асцярожныя, чым мужчыны, што вельмі важна пры перавозцы дзяцей.

Плануецца, што ўжо да канца года жоўтыя аўтобусы вытворчасці Мінскага аўтамабільнага завода будуць дастаўляць сельскіх дзяцей з невялікіх населеных пунктаў у буйныя аграгарадкі, дзе ёсць школы.

Асобна на сустрэчы абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з работай Еўразійскай эканамічнай камісіі. Як далажыў Сяргей Румас, які з'яўляецца членам Савета ЕЭК ад Беларусі, завяршаецца работа над напрамкамі далейшай інтэграцыі, якія Савет ЕЭК разгледзіць 21 красавіка. Пасля калегіяльнага абмеркавання ў ЕЭК яны будуць накіраваны ва ўрады трох краін, а затым 29 мая ўзгодненыя прапановы будуць прадстаўлены кіраўнікам дзяржаў на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Аляксандр Лукашэнка адобрыў ініцыятыўныя прапановы Беларусі і даручыў паскорыць работу над дагаворам аб Еўразійскім эканамічным саюзе.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы цікавіўся дзейнасцю асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола», старшынёй якой з'яўляецца Сяргей Румас. Прэзідэнту далажана аб старце 23-га чэмпіянату Беларусі, які праходзіць па новай формуле. Размова таксама ішла аб тым, наколькі змянілася колькасць легіянераў пасля ўкаранёнай ініцыятывы аб непрызнанні легіянерамі грамадзян Расіі і Казахстана для ўдзелу ў нацыянальным чэмпіянаце. Як адзначыў Сяргей Румас, колькасць легіянераў засталася на ранейшым узроўні, а таму не спраўдзіліся апасенні аб тым, што ў Беларусь прыедуць легіянеры з Расіі, прычым далёка не лепшай якасці.

Прэзідэнт даручыў прааналізаваць вынікі гэтых новаўвядзенняў, з тым каб у наступным годзе прыняць узважанае рашэнне, якое будзе адпавядаць інтарэсам беларускага футбола.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПАГРЭЙЦЕСЯ, ЖАВАРОНАЧКІ!

**У вёсцы Забалаць Любанскага раёна захаваўся старадаўні звычай адзначаць Дабравешчанне з карагодамі, перагукваннем, абыходам двароў з чырвонаю хусткаю, птушачкамі на дубчыках, таптаннем снегу, развітаннем з прадзівам, кіданнем сыру на бярозу. Яшчэ тут «грэюць» каля вогнішча «жаваранкаў» і адмыкаюць зямлю. І кожнае з гэтых абрадавых дзеянняў суправаджаецца песнямі-вяснянкамі. Галоўныя ўдзельнікі дабравешчанскіх гульняў не толькі дзяўчаты на выданні, але і маленькія дзяўчынкі і хлопчыкі, жанчыны старэйшага ўзросту, нават бабулі, якія частуюць гукальшчыкаў вясны выпечанымі загадзя «жаваранкамі». А забалоцкія гаспадары дастаюць з патаемных куточкаў ключы і адмыкаюць замкнёныя яшчэ на Пакровы замкі. Не абышлося без гэтых пракаветных традыцый і сёлетняе забалацкае Дабравешчанне.** СТАР 3

ПРАКАВЕТНАЕ

*ЛІЧБА ДНЯ*

**1,1%**

***склала інфляцыя ў Беларусі ў сакавіку 2013 года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Цэны на харчовыя тавары ў сакавіку 2013 года ў параўнанні з лютым павялічыліся на 0,6%, са снежнем 2012 года — на 5,2%. На нехарчовыя тавары ў сакавіку да лютага — на 0,4%, да снежня — на 1,8%. Кошты і тарыфы на платныя паслугі ў сакавіку ў параўнанні з лютым сталі вышэй на 3%, са снежнем 2012 года — на 12%. У 2013 годзе прагноз па інфляцыі ўстаноўлены на ўзроўні 12%. Інфляцыя ў студзені 2013 года склала 3%, у лютым — 1,2%.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.04.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8650,00 | ▼ |
| Еўра | 11250,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 273,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1062,46 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 6° |
| Віцебск | + 2° |
| Гомель | + 8° |
| Гродна | + 2° |
| Магілёў | + 3° |
| Мінск | + 2° |

## БАРЫС БАТУРА ДАЛАЖЫЎ АБ ПАВОДКАВАЙ СІТУАЦЫІ НА МІНШЧЫНЕ І ГАТОЎНАСЦІ ДА СЯЎБЫ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 красавіка правёў рабочую сустрэчу са старшынёй Мінскага аблвыканкама Барысам Батурам.**

Кіраўніку дзяржавы далажана аб паводкавай сітуацыі ў сталічным рэгіёне. Паводле слоў губернатара, падтапленні чакаюцца ў Барысаўскім, Маладзечанскім, Пухавіцкім і Стаўбцоўскім раёнах. Аднак нейкіх надзвычайных сітуацый не прагназуецца, у тым ліку дзякуючы загадзя праведзеным работам па абсталяванні проціпаводкавых збудаванняў.

Аляксандр Лукашэнка даручыў прыняць меры, дзе гэта неабходна, для прадухілення падтапленняў жылых дамоў і прысядзібных участкаў талымі водамі.

У цэнтры ўвагі таксама былі пытанні правядзення ў сціслыя тэрміны пасяўной кампаніі. Барыс Батура запэўніў, што Мінская вобласць да гэтага гатова і пры першай магчымасці ў рэгіёне пачнуцца палявыя работы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанаваны варыянт па рэканструкцыі аўтадарогі Мінск—Слуцк—Мікашэвічы, у адпаведнасці з якім яе плануецца давесці да параметраў першай катэгорыі. Прэзідэнту таксама далажана аб рэалізацыі шэрага іншых інвестыцыйных праектаў.

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на пытанні навядзення парадку ў населеных пунктах. Ён запатрабаваў, каб гэтым працэсам былі ахоплены не толькі буйныя гарады і раённыя цэнтры, але і невялікія сельскія паселішчы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЗВАРОТ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ СА ШТОГАДОВЫМ ПАСЛАННЕМ БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ І НАЦЫЯНАЛЬНАМУ СХОДУ ЗАПЛАНАВАНЫ НА 19 КРАСАВІКА

Аб гэтым паведамілі **БЕЛТА** ў Палаце прадстаўнікоў.

Са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Прэзідэнт звернецца ў час сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

■ Сустрэча без абцасаў

## «Лянівыя старэюць раней!»

Наталля Наважылава ўпэўнена, што можна і ў 100 гадоў застацца вясёлым і здаровым

**Глядзіш на Наталлю Наважылаву — і дзіву даешся. Той жа бляск у вачах, які зараджаў з тэлеэкрана ў 1990-х. Той жа бадзёры голас, які падымаў з канап нават самых лянівых. Тая ж лёгкасць і плаўнасць рухаў... Змянілася толькі месца: былая тэлевядучая «Урокаў Наталлі Наважылавай» цяпер выкладае сучасны фітнэс ва ўласным цэнтры «Багіра». Менавіта там, у акружэнні мячоў, гантэляў і трэнажораў, вядомая фітнэс-лэдзі дала чытачкам «Звязды» сем урокаў маладосці, здароўя, бадзёрасці і прывабнасці...**



ФОТА Надзеі БУЖАН.

### УРОК ПЕРШЫ: стройная — звонку, поўная — знутры

**Часта позіркам «выхопліваю» з натоўпу** прыгожых людзей і радуюся за іх. Прыгажосць у маім уяўленні — гэта не толькі стройная фігура (здаровае, дагледжанае цела можа мець любыя *разумныя (!) памеры*) ды прыгожае адзенне, але і нейкая невытлумачальная энергетыка, якая зараджае сваім святлом. Праўда, апошнім часам чамусьці ўсё часцей і часцей сустракаю жанчын з сумнымі вачыма...

**Мяне заўсёды здзіўляла,** што беларускі надаюць празмерна вялікае значэнне адзенню і касметыцы. І ў той жа час надаюць мала ўвагі свайму здароўю, фігуры. Яны горда ідуць па вуліцы з цэлюлітам, затое з макіяжам у тры слаі. А лепш бы наадварот!..

**Згодна з Чэхавым,** што «ў чалавеку павінна быць усё выдатна: і твар, і адзенне, і душа, і думкі». Па-сапраўднаму прыгожая жанчына, з аднаго боку, стройная — звонку, а з другога, поўная — знутры. Прыгожая жанчына без ўнутранага зместу — гэта заўсёды вельмі трагічна для яе самой. Бо, як правіла, мужчыны, якія цэняць толькі знешнюю прыгажосць, маюць не адну ляльку. Як толькі гэта «паднасілася», з ёй расстаюцца і набываюць новую.

### УРОК ДРУГІ: не махайце на сябе рукой

**Мае замежныя сябры** здзіўляюцца таму, як шмат у нас маладых прыгожых дзяўчат! А вось дарослых жанчын, якія нарадзілі аднаго, дваіх, траіх дзяцей і засталіся спартыўнымі, дагледжанымі, на жаль, меней. За мяжой жанчыны пасля сарака выглядаюць лепш за нашых!..

**Пакуль дзяўчына не дасягнула мэты** — не выйшла замуж, яна сочыць за сабой. Знаходзіць на гэта і час, і сродкі. Пасля таго, як выходзіць замуж, у большасці, «махае на сябе рукой». Не толькі на знешнасць, але і на ўнутранае развіццё. Кар'ера адыходзіць на апошні план. А вось карміць мужа, даглядаць дзяцей — гэта ў нас моцна ў традыцыях. Праходзіць 10 гадоў — і тая стройная дзяўчынаператвараецца ў грузную цёцю. Не дзіўна, што муж сыходзіць. Хоць і пельмені не менш смачныя, і сарочкі папрасаваныя... І справа нават не ў фігуры... Проста ён развіваецца, а яна стаіць на месцы. СТАР 3

## НА ВЫХАДНЫЯ — РЭЗКАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ

**На працягу бягучага тыдня на тэрыторыю Беларусі нарэшце завітае сапраўдная вясна, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла ПАРАШЧУК.**

Рэзкая змена надвор'я чакаецца ўдзень у сераду. У паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкай і Гродзенскай вобласці 10 красавіка будзе ўжо ўдзень плюс 9—11 градусаў. На астатняй тэрыторыі ўдзень — 2—8 цяпла. Тэмпература паветра ўначы ад плюс 1 градуса па паўднёвым захадзе да мінус 8 па паўночным усходзе. Паўсюдна ў сераду будзе ісці кароткачасовы мокры снег і дождж.

У чацвер і пятніцу стане яшчэ цяплей. Уначы прагназуецца ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, удзень — ад плюс 5 па паўночным усходзе да 13 цяпла на поўдні Беларусі.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у выхадныя ў нашай краіне будзе гаспадарыць цёплы цыклон. Нават уначы чакаецца плюс 1—7 градусаў, удзень — 8—13 цяпла, а на поўдні краіны — плюс 14—16 градусаў. А вось такі тэмпературны фон будзе ўжо на 2—4 градусы вышэй за кліматычную норму другой дэкады красавіка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ЯК ЖЫВЕЦЦА Ў ДОМЕ-ІНТЭРНАЦЕ ДЛЯ САСТАРЭЛЫХ І ІНВАЛІДАЎ?

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Беларусі пад эгідай газеты «Звязда» пройдзе «прамая тэлефонная лінія» па тэме «Новыя формы сацыяльнага абслугоўвання ў дамах-інтэрнатах для састарэлых і інвалідаў». На ўсе вашы пытанні адкажа **начальнік упраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Мінпрацы і сацабароны Марыя Аляксандраўна ГАРБАЦЭВІЧ.**

Тэлефануйце ў сераду, **10 красавіка, з 11 да 12 гадзін па нумары (017) 222-49-25.** Адказы на найбольш актуальныя пытанні будуць апублікаваны ў газеце.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПАМЕРЛА МАРГАРЭТ ТЭТЧЭР



У Вялікабрытаніі памерла былая прэм'ер-міністр краіны Маргарэт Тэтчэр. «Жалезная лэдзі» пайшла з жыцця ва ўзросце 87 гадоў. «Марк і Кэрал Тэтчэр паведамілі, што іх маці, баранэса Тэтчэр, памерла сваёй смерцю ў выніку ранней перанесенага інсульту ўчора раніцай», — паведаміў прэс-сакратар памерлай. Як удакладняюць інфармагенцтвы, у Маргарэт Тэтчэр здарыўся інсульт. У апошнія гады яна пакутавала на хваробу Альцгеймера. Прэм'ер-міністр Злучанага Каралеўства Дэвід Кэмеран, заявіў, што краіна страціла «выдатнага палітычнага дзеяча і выдатнага прэм'ер-міністра». Каралева таксама была засмучана, пачуўшы навіны пра смерць баранэсы Тэтчэр.

Маргарэт Тэтчэр была 71-м прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі, яна займала гэтую пасаду з 1979-га па 1990 год і была першай і адзінай у гісторыі жанчынай, якая ўзначальвала ўрад Вялікабрытаніі. Для сваіх прыхільнікаў Тэтчэр застаецца палітычнай фігурай, якая змагла аднавіць брытанскую эканоміку, нанесці істотны ўдар па прафсаюзах і аднавіць імідж Вялікабрытаніі ў якасці сусветнай дзяржавы.

### СААКАШВІЛІ ШПІТАЛІЗАВАЛІ ПАСЛЯ ПАДЗЕННЯ З ВЕЛАСІПЕДА

Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі трапіў у бальніцу пасля падзення з веласіпеда. Пра гэта паведамляе Hurriyet. Інцыдэнт, паводле паведамленняў інфармацыйных агенцтваў, адбыўся ў нядзелю, калі грузінскі прэзідэнт, які знаходзіцца з візітам у Стамбуле, здзяйсняў веласіпедны шпацыр. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, у выніку падзення ён зламаў руку.

### КАЛІЙ — МАГУТНАЯ ЗБРОЯ СУПРАЦЬ ГІПЕРТАНІІ І ІНСУЛЬТУ

Павелічэнне спажывання калію з прадуктамі харчавання і частковая адмова ад солі дазволяць абараніць сэрца і сасуды. Паводле падлікаў вучоных, дастаткова ўнесці 2-3 дадатковыя порцыі садавіны ці гародніны ў дзённы рацыён, каб змяніць становішча спраў, паведамляе BBC.

А нізкі ўзровень спажывання солі яшчэ больш узмацняе пазітыўны эфект. Што важна, калій не стварае пабочных эфектаў на работу нырак або ўзровень гармонаў. Згодна з рэкамендацыямі СААЗ, норма для дарослага — больш за 4 грамы на дзень. Было даказана: калі павялічыць аб'ём калію ў рацыёне на 3-4 грамы ў дзень, то можна рэальна кантраляваць ціск і знізіць рызыку інсульту ў дарослага чалавека на 24%. Незалежнае даследаванне, прысвечанае ролі солі, паказала: калі крыху паменшыць колькасць спажыванай солі тэрмінам на 4 тыдні і больш, то ціск моцна знізіцца ў людзей з нармальнымі і павышанымі паказчыкамі. А паніжаны ціск, як вядома, скарачае рызыку інсульту.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### РАСІЯНАМ ЗАБАРАНІЛІ МАЦЮКАЦЦА Ў СМІ

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў закон, які вызначае штрафы за выкарыстанне нецэнзурных слоў і выразаў у СМІ, паведамляюць інфармагенцтвы. Згодна з законам, устанаўліваецца адміністрацыйная адказнасць за выраб і распаўсюджванне прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая змяшчае нецэнзурную лаянку.

Закон забараняе распаўсюджваць часткова завуаляваны мат — усе нецэнзурныя выразы павінны «запіквацца» цалкам. Дакумент прадугледжвае штрафы ў памеры ад 2 да 3 тыс. расійскіх рублёў для звычайных грамадзян, ад 5 да 20 тыс. — для службовых асоб і ад 20 да 200 тыс. — для юрыдычных. Дакладнага спіса забароненых выразаў у законе не прыведзена.

КОРАТКА

**У Беларусі аб'ём крэдытаў, выдадзеных на будаўніцтва жылля, павялічыўся за студзень-люты 2013 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2012 года ў супастаўных цэнах на 43,4 працэнта і склаў Br1 трлн 794,1 млрд.**

У гэтым годзе плануецца адкрыццё пяці аддзяленняў гемадыялізу: у Любані Мінскай вобласці, Талачыне Віцебскай вобласці, Рэчыцы Гомельскай вобласці, Кобрыне Брэсцкай вобласці і ў Магілёўскай гарадской бальніцы №2.

**У мінулым годзе ў Беларусь пастаўлена 21,5 млн тон нафты, перапрацавана з улікам пераходных астаткаў 21,7 млн тон.**

У Мінску ў першым квартале гэтага года ўведзена 254,8 тыс. кв.м жылля, што на 32 працэнты больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Аб'ём уведзенага ў эксплуатацыю жылля перасягне заданне на 69,8 працэнта.

**Увядзенне дыферэнцыраваных тарыфаў дасць магчымасць у 2013 годзе сэканоміць 5% спажытай насельніцтвам электраэнергіі.**

## ЦІ ВЕРЫЦЕ ВЫ Ў ГАРАСКОПЫ І ПРАДКАЗАННІ?



**Марыя ВІКТАРОВІЧ, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта:**

— Я лічу, што ўсё ў жыцці не проста так. Тайна імені, зоркі, лічбы — гэтыя рэчы здольныя ўплываць на наш лёс. У мяне заўсёды так атрымліваецца, што прадказанні збываюцца. Напісана, што пасварышся з блізкімі — так і будзе. Калі ў жыццёвых сітуацыях аказваюся на раздарожжы, то, прымаючы рашэнне, прыслухоўваюся не толькі да розуму, але і да гараскопаў і прадказанняў. Неяк з Партугаліі мне прывезлі цукеркі ў падарунак. Маленькая каробачка была перавязана стужачкамі. Лічыцца, што калі такую стужачку завязаць на руку, пры гэтым загадаць жаданне і з'есці цукерку, а потым дачакацца, пакуль стужка сама парвецца, то ўсё здзейсніцца. Гэта было якраз падчас майго ўдзелу ў адным конкурсе — і я перамагла.



**Ганна ГРЫБІНІК, дыспетчар службы таксі, г. Брэст:**

— Цікавіцца гараскопамі пачала ў юнацтве. Цікава было чытаць пра свой знак і сумяшчальнасць у пары. З гадамі ў пытанні «верыць ці не верыць» стала ўсё больш схіляцца да станоўчага адказу. Па даце нараджэння на сайтах, што трапляліся, пабудавала натальную карту для сябе і сваіх блізкіх. Гэтая інфармацыя дапамагала мне зразумець сябе, пераадолець унутраныя канфлікты і нават павысіць самаацэнку. Таму да астралогіі стаўлюся сур'ёзна. А што датычыцца прадказанняў, то тут таксама ёсць пэўны вопыт. Наведвала неяк варажбітку. Прадказанні збыліся 50 на 50, але варта аддаць ёй належнае — псіхалагічны партрэт па фота быў дакладным.



**Юлія РЫПІНСКАЯ, спартсмен-інструктар нацыянальнай зборнай па цяжкай атлетыцы, г. Мінск:**

— Я чалавек па прыродзе сваёй уражлівы. Мяне цікавяць гараскопы і прадказанні. Мяркуючы па ўласным вопыце, адназначна не магу сцвярджаць, што гараскопы заўсёды збываюцца. Але здаралася і так. Напрыклад, неяк перад адказнымі спаборніцтвамі я прачытала: «Запас энергіі памножыўся ўдвая! Сёння толькі гучныя ўчынкі! З вашым запасам энергіі вы маеце ўсе шанцы заявіць свету пра сябе». І збылося — я выйграла чэмпіянат Еўропы... У прадказанні таксама веру. І веру ў людзей, якія здольны прыадкрыць будучы лёс.

**Падрыхтавала Алена ДРАПКО.**

■ Тэма дня

# СПОЗНІШСЯ — ПРАЙГРАЕШ

## Новыя «правілы гульні» для малака, мяса і... абсталявання для дзіцячых пляцовак

**Як днямі паведамляла «Звязда», з 1 ліпеня ў Мытным саюзе Расіі, Беларусі і Казахстана ўводзяцца ў дзеянне тэхнічныя рэгламенты на прадукцыю харчовай прамысловасці, якія датычацца многіх нашых прадпрыемстваў. Ці гатовы яны да новых «правілаў гульні»? Гэтай тэме была прысвечана нарада, якую арганізавалі Камітэт дзяржкантролю Гродзенскай вобласці і Лідскі райвыканкам.**

Адзіная сістэма тэхнічнага рэгулявання з'яўляецца ключавой умовай для ажыццяўлення бесперашкодных паставак прадукцыі на мытнай тэрыторыі Расіі, Беларусі і Казахстана. Толькі пры яе наяўнасці гарантуецца бяспека тавараў і паслуг для спажыўцоў, канкурэнтаздольнасць прадукцыі ўнутры Мытнага саюза і за яго межамі, а таксама зніжэнне адміністрацыйнай і эканамічнай нагрузкі на бізнес.

Сёння ў Мытным саюзе зацверджаны 31 тэхнічны рэгламент на розныя віды прадукцыі і паслуг. Сёлета плануецца, напрыклад, распрацоўка рэгламентаў на патрабаванні да ўгнаенняў, сінтэтычных мыйных сродкаў і тавараў бытавой хіміі, лакафарбавых і будаўнічых матэрыялаў, энергетычнай эфектыўнасці электрычных энергаспажывальных прылад, а таксама па бяспецы атракцыёнаў і абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак. А аднымі з важнейшых з'яўляюцца, зразумела, тэхнічныя рэгламенты на харчовую прадукцыю.

— Ад іх укаранення наўпрост залежыць лёс прадпрыемстваў і наш экспартны патэнцыял, які з'яўляецца важнай умовай эканамічнай бяспекі дзяржавы. І калі нейкія суб'екты гаспадарання своечасова не ўкараняць тэхнічныя рэгламенты, то яны, па сутнасці, стануць недзеяздольнымі і не будуць ведаць, што рабіць са сваёй прадукцыяй. Гэта пагражае яе вяртаннем, забаронай на выпуск, штрафнымі санкцыямі і іншымі непрыемнасцямі, — падкрэсліў **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандр ЯКАБСОН.**

На жаль, у Камітэта дзяржкантролю ёсць падставы для заклапочанасці. На шэрагу прадпрыемстваў пакуль не ўсвядомілі неабходнасць рэфармавання сваёй дзейнасці і пераходу на комплексныя тэхнічныя дакументы, не клапоцяцца аб падрыхтоўцы спецыялістаў, здольных кампетэнтна працаваць ва ўмовах адзінай мытнай прасторы. Некаторыя вытворцы пакідаюць на апошнія дні падрыхтоўку да ўкаранення тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза і ў выніку могуць стварыць ажыятаж у выпрабавальных лабараторыях.

Напрыклад, як айчынныя прадпрыемствы ўкараняюць міжнародную сістэму менеджменту якасці ХАССП, якая кіруе бяспекай харчовых прадуктаў на ўсіх этапах вытворчасці, а таксама захоўвання і рэалізацыі прадукцыі? Быццам і някепска, некаторыя рапартуюць, што гэтая сістэма ў іх ужо дзейнічае. Але на самой справе, адзначаюць спецыялісты Дзяржстандарта, сфера яе распаўсюджання даволі вузкая, толькі на асобныя звёны вытворчага працэсу. І калі сёння не паклапаціцца аб комплексным укараненні гэтай сістэмы, то ўжо заўтра можна сутыкнуцца з сур'ёзнымі бар'ерамі на знешніх рынках. Паколькі Мытны саюз — гэта не толькі механізм інтэграцыйных працэсаў у галіне гандлю, але і жорсткая канкурэнцыя, дзе ёсць лідары і няўдачнікі. І ніхто за апошніх, акрамя іх саміх, перажываць не будзе.

Распрацоўка і ўкараненне нарматыўных дакументаў па тэхнічных рэгламентах у Еўразійскай эканамічнай камісіі праходзіць вельмі няпроста, пры сутыкненні розных меркаванняў, звязаных з інтарэсамі кожнай краіны. Пры гэтым заканадаўчая база Мытнага саюза — гэта жывы механізм, успрымальны да прапаноў з боку вытворцаў, паколькі ніводзін рэгулятар не ў стане лепш за іх ведаць спецыфіку той ці іншай прадукцыі ці паслугі.

**Мытны саюз — гэта не толькі механізм інтэграцыйных працэсаў у галіне гандлю, але і жорсткая канкурэнцыя, дзе ёсць лідары і няўдачнікі.**

— На жаль, беларускі бізнес паводзіць сябе ў гэтых пытаннях не надта актыўна. Не параўнаць з расіянамі — яны (прадпрыемствы, бізнес-асацыяцыі) літаральна не выходзяць з кабінетаў Еўразійскай эканамічнай камісіі, пасяджэнняў кансультатыўнага камітэта. «Насмерць» стаяць, каб дамагчыся ўліку сваіх патрабаванняў. А мы «за вушы» выцягваем нашы вядучыя прадпрыемствы, каб паехалі на нейкае пасяджэнне і дакладна выказалі сваю пазіцыю. Трэба на ўзроўні галіны, бізнес-асацыяцыі, рэгіёна рыхтаваць прапановы па дагаворна-прававой базе Мытнага саюза. Бо ўносіць потым змяненні ў дзесяць разоў цяжэй, чым адстаяць сваю пазіцыю на стадыі падпісання рэгламента, — зазначае **старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА.**

Зрэшты, тэхнічныя рэгламенты на прадукцыю — зусім не гарантыя яе паспяховай рэалізацыі. Гэта толькі пэўныя гарантыі бяспекі тавару для спажыўцоў і, адпаведна, абавязковыя ўмовы для вытворцаў, каб трапіць на рынкі Мытнага саюза, а таксама скарыстацца магчымасцямі рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі як плацдарма для экспарту ў іншыя краіны свету. А далей, атрымаўшы такое права, трэба ва ўмовах канкурэнцыі дамагчыся, каб спажывец узяў менавіта вашу прадукцыю.

Пры гэтым рыхтуюцца адзіныя прынцыпы кантролю і меры адказнасці за парушэнні правілаў і працэдур тэхнічных рэгламентаў, паведаміў **член калегіі па пытаннях тэхнічнага рэгулявання Еўразійскай эканамічнай камісіі Валерый КАРАШКОЎ**. Дзяржстандарт Беларусі спыніў на нашай тэрыторыі дзеянне ўжо некалькіх дзясяткаў сертыфікатаў, якія, на яго думку, былі неабгрунтавана выдадзены асобнымі органамі іншых краін Мытнага саюза. Таму, калі не стварыць эфектыўную сістэму нагляду на рынку, то ўся ідэя па забеспячэнні бяспекі прадукцыі становіцца толькі тэорыяй.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

# Футбольнае «Дынама» перамагае, а гандбольная зборная змагаецца за квіток на кантынентальнае першынство

**Нядаўнія выхадныя былі багатымі на сонечнае святло і вікторыі нашых спартсменаў. У чарговым аглядзе «Звязда» ўзгадвае апошнія дасягненні беларусаў на міжнароднай і ўнутранай арэнах.**

**1. ПАЧНЁМ З ХАКЕЯ.** Зборная Беларусі працягвае рыхтавацца да чарговага першынства свету, якое сёлета прыме Стакгольм і Хельсінкі. У праграме нашай зборнай шэраг спарынгаў, частку якіх беларусы ўжо правялі. У межах так званага Еўравыкліку хлопцы Андрэя Скабелкі дома двойчы сустракаліся з немцамі. І калі ў першай сустрэчы, у Мінску, яны перамогу атрымалі толькі ў серыі булітаў, дык у другім, салігорскім паядынку, суайчыннікі перайгралі сапернікаў даволі ўпэўнена — 4:2. Дарэчы, запомніліся госці даволі арыгінальным спічам трэнера Пэта Карціна. Пасля першай сустрэчы на «Мінск-Арэне» ён не сказаў нешта банальнае кшталту «Спасибо, Минск! У вас очень чистый город», а па-беларуску звярнуўся да візаві са словамі «Віншую майго калегу!». Вось і парадокс: часам на мове хутчэй пачне размаўляць замежнік, чым карэнны беларус... Але вернемся да хакея. У планах зборнай яшчэ два матчы, якія павінны адбыцца ў нашых гарадах. 12 красавіка ў Жлобіне беларусы сустрэнуцца са зборнай Славакіі, а на наступны дзень прымуць славакаў на «Бабруйск-Арэне».

**2. МУЖЧЫНСКАЯ ЗБОРНАЯ** па тэнісе герачнымі высілкамі захавала сабе месца ў 2-й групе Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса. У Тунісе беларусы на роўных супрацьстаялі мясцовым майстрам ракеткі. Пасля двух дзён лік быў нічыйным— 2:2. Усё вызначылася ў апошнім паядынку, калі дэбютант нашай каманды Ягор Герасімаў вырваў перамогу з рук Махамеда Абіда — 6:7, 6:4, 6:1, 5:7, 6:4. Акрамя Герасімава, за вікторыю для Беларусі змагаліся Максім Мірны, Аляксандр Буры і Уладзімір Ігнацік.

**3. ДАР'Я ДОМРАЧАВА** завяршыла біятлонны сезон так званай Гонкай чэмпіёнаў, якая традыцыйна праходзіць у Маскве. «Разыначка» мерапрыемства ў тым, што гэтыя старты адбываюцца не толькі на свежым паветры, але і ў крытым памяшканні. Такім у Маскве стаў спартыўны комплекс «Алімпійскі». У мас-старце наша Даша прыйшла трэцяй, прапусціла наперад Настассю Кузьміну і Кяйсу Мякарайнэн. У змешанай эстафеце Домрачава разам са шведам Б'ёрнам Фэры завяршыла гонку пятай.

**4. ЗБОРНАЯ БЕЛАРУСІ** па гандболе працягвае змагацца за пуцёўку на чэмпіянат Еўропы. Гэтымі днямі падапечныя Юрыя Шаўцова двойчы згулялі са зборнай Румыніі, камандай, у якой у мінулым былі цудоўныя перамогі, аднак зараз гандбол на радзіме графа Дракулы знаходзіцца ў крызісе. На шчасце, гандбалісты ў зялёных майках двойчы перамаглі апанентаў (34:31 і 31:25). Адметна, што за падзеямі другой сустрэчы сачыў Аляксандр Лукашэнка. «У маёй працы ў Беларусі гэта першы раз, калі Прэзідэнт аказаўся на трыбунах. Для ўсіх нас гэта вялікі гонар. Цудоўны стымул для далейшай працы», — прызнаўся пасля гульні Шаўцоў. У 6-й групе беларусы пакуль знаходзяцца на другім радку. Першае месца займае Ісландыя, 3-е — Славенія, а на апошнім месцы з нулём балаў у скарбонцы каманда Румыніі.

**5. НАПРЫКАНЦЫ ПРА ФУТБОЛ.** Ён у нас пакуль яшчэ толькі ажывае пасля зімовай спячкі, нават не можа выйсці на шырокую прастору стадыёнаў (з-за наступстваў «Хаўера» некаторыя каманды працягваюць гуляць на штучным пакрыцці). Але жыццё ў чэмпіянаце бурліць, прыносіць цікавыя вынікі. У другім туры айчыннага першынства БАТЭ ў гасцях перайграў «Славію» (1:0), «Белшына» падзяліла балы з «Нёманам» (2:2), мінскае «Дынама» ў цэнтральным матчы тура ўпэўнена перайграла «Мінск» (3:0), «Тарпеда» ў Жодзіне перамагло магілёўскае «Дняпро» (1:0), а сустрэчы «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск) і «Гомель» — «Нафтан» (Наваполацк) завяршыліся тады, калі нумар ужо быў падпісаны ў друк. Асабліва адзначым вікторыю мінскіх «дынамаўцаў». З кожнай гульнёй у Алега Пратасава вымалёўваецца цікавы, па-свойму адметны футбольны калектыў, што, безумоўна, ідзе толькі на карысць беларускаму чэмпіянату.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



«Дынама» — «Мінск».

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Май на ўвазе!

# МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ — СТЫПЕНДЫІ НА ПАДСТАВЕ КОНКУРСУ

**Зацверджаны 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, якія працуюць у арганізацыях, занятых навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных, гуманітарных навук. Стыпендыі прызначаны на 2014 год у памеры, устаноўленым Прэзідэнтам на падставе прапаноў спецыяльна створанай міжведамаснай камісіі.**

Для ўдзелу ў конкурсе прапануюцца кандыдатуры дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатаў навук — да 35 гадоў, вучоных без ступені — да 30 гадоў. Улічваюцца іх дасягненні ў прыярытэтных кірунках фундаментальных і прыкладных навуковых даследаваннях, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, уклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны.

Кандыдатуры вылучаюць арганізацыі па асноўным месцы працы, на сходзе навуковых работнікаў або вучоным савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў структурнага падраздзялення. Улічваюцца водгукі не менш як двух незалежных экспертаў.

Дакументы на конкурс прадастаўляюцца да 1 ліпеня 2013 года...

...у Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі, па адрасе: 220072, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 66, Прэзідыум НАН Беларусі. Тэлефоны для даведак: (017) 284 11 63, 284 24 56;

...у Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі вышэйшай адукацыі, па адрасе: 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 9, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 200 52 01;

...у Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, якія выконваюць навуковыя доследы і распрацоўкі, па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная,1, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. Тэлефон для даведак: (017) 294 92 70.

**Больш падрабязная інфармацыя аб парадку правядзення конкурсу і афармленні неабходных дакументаў размешчана на сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь — http://gknt.org.by.**

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

**РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 26 апреля 2013 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»**

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | **Помещение на 2-м этаже капитального строения, здания 21 городского отделения связи (инв. №100/С-45930), по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Орловская, д. 24** | 4 018 350 | 401 835 | 186,9, в т.ч. 165,5 (19,2; 14,5; 14,3; 16,7; 13,7; 11,4; 10,6; 65,1) всп.пл. 21,4 (8,1; 6,1; 1,0; 1,5; 4,7) | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | Право заключения договора аренды |
| **Наименование арендодателя** | РУП «Белпочта» |
| **Срок договора аренды** | 5 лет |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений.<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в рег. дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 26 апреля 2013 г. в 11.00 (лот № 1) по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325.**
**Последний день приема заявлений – 25 апреля 2013 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ВЫВЕЛА З ПАЖАРУ ТРАІХ ДЗЯЦЕЙ

**У сталіцы жанчына пры спробе патушыць пажар атрымала моцныя апёкі. Але яна паспела вывесці з кватэры траіх дзяцей.**

Пра дым з акна кватэры на шостым паверсе дзевяціпавярховага жылога дома па вуліцы Каменнагорскай пасля 10 гадзін раніцы пажарным-выратавальнікам пачалі паведамляць і выпадковыя сведкі, і самі жыльцы дома. Работнікі МНС з кватэры, якая гарэла, выратавалі жонку гаспадара, 32-гадовую жанчыну, якая была ў беспрытомнасці. Паводле слоў дзяцей, да прыбыцця выратавальнікаў маці вывела іх з жылля і самастойна прыступіла да тушэння пажару. У выніку жанчына атрымала апёкі цела першай-трэцяй ступені 50 працэнтаў паверхні цела, тэрмаінгаляцыйную траўму і брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі была шпіталізавана ў гарадскую клінічную бальніцу хуткай дапамогі. З размешчаных вышэй кватэр без сродкаў выратавання было эвакуіравана 25 чалавек.

Пасля агляду 11-гадовая дачка гаспадыні таксама была дастаўлена з дыягназам «тэрмаінгаляцыйная траўма» ў тую ж бальніцу, што і маці. 8-гадовую дачку і 5-гадовага сына адвезлі ў трэцюю дзіцячую гарадскую клінічную бальніцу з дыягназам «таксічнае дзеянне чаднага газу».

У выніку пажару ў кватэры была пашкоджана маёмасць у жылым пакоі на плошчы 12 квадратных метраў. Прычына здарэння высвятляецца, мяркуецца, што пажар адбыўся з-за дзіцячага свавольства з агнём. Дарэчы, у жыллі быў аўтаномны пажарны апавяшчальнік, аднак ён не спрацаваў з-за адсутнасці элементаў сілкавання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ ПАДТОПЛЕНА БОЛЬШ ЗА 300 ПАДВОРКАЎ

**За мінулыя выхадныя паводкай і талымі водамі ў Гомельскай вобласці падтоплена больш за 300 падворкаў.**

Новыя факты падтапленняў зафіксаваны ў выніку ўздыму рэк у Петрыкаўскім, Жыткавіцкім, Рэчыцкім, Лельчыцкім раёнах. Тут адзначаецца значны рост узроўню вады ў Прыпяці, Ведрычы і Убарці. У Лельчыцкім раёне 30 м аўтадарогі паміж вёскамі Баравое і Тартак апынулася пад вадой. Там жа адбылося падтапленне драўлянага моста ў вёску Мілошавічы. Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, сур'ёзныя праблемы жыхарам стварае і актыўнае раставанне снегу — такім чынам падтоплена 35 жылых дамоў, 32 сутарэнні, 83 падворкі ў Буда-Кашалёўскім, Петрыкаўскім, Рэчыцкім, Гомельскім, Нараўлянскім, Хойніцкім раёнах, а таксама ў Гомелі.

Адпампоўваць ваду насельніцтву дапамагаюць супрацоўнікі прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Пры гэтым неабходнасці ў эвакуацыі людзей пакуль няма, жыццядзейнасць населеных пунктаў не парушана. Вядзецца пастаянны маніторынг паводкавай сітуацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## БАРАНІЦЬ ПУШЧУ АД АГНЮ — РАЗАМ

**Шырокамаштабны праект падраздзяленняў пажарнай службы памежных краін «Захаваем Белавежскую пушчу разам» неўзабаве стартуе па лініі трансгранічнага супрацоўніцтва.**

Пушча, як вядома, размешчана на тэрыторыі дзвюх дзяржаў — Беларусі і Польшчы. І бараніць яе ад вогненнай стыхіі трэба разам, бо агонь не прызнае межаў. На гэта і накіраваны праект еўрарэгіёна «Белавежская пушча». У ходзе перамоў прынята праграма мерапрыемстваў на бліжэйшыя 20 месяцаў. Адным з галоўных пунктаў згаданай праграмы можна лічыць набыццё тэхнікі: каля двух дзясяткаў пажарных машын, выратавальны катар, іншае абсталяванне. Як паведаміў **начальнік цэнтра прапаганды і навучання Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Мікалай КУЗЬМІЦКІ,** будаўніцтва пажарна-выратавальнага паста вядзецца зараз у Камянюках. Пост мяркуецца аснасціць тэхнікай, набытай у рамках праекта.

**Яна СВЕТАВА.**

## БЫЛАЯ КОННАЯ ПОШТА СТАНЕ ХРАМАМ

**У Гарадку Віцебскай вобласці дарэвалюцыйны будынак былой коннай пошты стане праваслаўным храмам.**

— У чэрвені мінулага года, — расказвае настаяцель царквы, іерэй Аляксандр Кананові ч, — Віцебскім аблвыканкамам у Гарадку быў зарэгістраваны прыход храма ў гонар святога апостала Андрэя Першазванага. — Ён размешчаны ў старадаўнім будынку былой коннай пошты. І, вядома ж, даўно мае патрэбу ў рэканструкцыі. Шмат што зроблена ў тым ліку і тымі, хто прыняў удзел у рамонце гэтай царквы. Але трэба будзе зрабіць яшчэ больш.

У сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам парафіяльная рада храма ў гонар апостала Андрэя Першазванага Гарадка звярнуўся з просьбай да ўсіх грамадзян, кіраўнікоў арганізацый і прадпрыемстваў, прадпрымальнікаў з заклікам аб аказанні пасільнай дабрачыннай дапамогі ў такой добрай справе, як стварэнне святыні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЛЁД НЕ ВЫТРЫМАЎ

**Апошняй аказалася прагулка па вясновым лёдзе для 47-гадовага мужчыны, які выйшаў у нецвярозым стане да Сажа падыхаць паветрам.**

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС расказалі, што, калі на месца здарэння ля вёскі Красны Бераг прыехалі чачэрскія выратавальнікі і хуткая меддапамога, грамадзянін ужо праваліўся пад лёд і патануў. Выратаваць яго не ўдалося.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

# ВЯСНА ПРЫЙДЗЕ З УСХОДУ



**У нас.** Не толькі звычайная, але і палітычная вясна ў Беларусі не задалася. Улады не выступаюць з нейкімі вялікімі ініцыятывамі. Выбарчых кампаній няма. Апазіцыя яўна знаходзіцца ў поўнай разгубленасці. Сведчанне таму — правядзенне чарговага «Дня волі», на які сабралася не больш за тысячу чалавек.

Таму на фоне адсутнасці больш важных навін мінулы тыдзень прайшоў пад знакам 2 красавіка — Дня адзінства народаў Расіі і Беларусі.

Чарговая гадавіна пачатку інтэграцыйных працэсаў паміж Беларуссю і Расіяй выклікала вялікі рэзананс і ў грамадскіх, і ў палітычных асяродках, адпаведна і ў СМІ.

Дасягненні расійска-беларускага саюза відавочныя. Тавараабарот летась дасягнуў рэкордных 42,8 мільярда долараў. Пры гэтым казаць пра нейкую залежнасць Беларусі ад рынкаў усходняга суседа не прыходзіцца, бо адначасова расце і гандаль з краінамі Еўрасаюза, павялічваецца доля іншых рэгіёнаў свету. Дасягнута значная каапераця ў прамысловасці — дзякуючы праграмам Саюзнай дзяржавы за мінулыя гады створаны звыш за 3,5 мільёна новых рабочых месцаў. Нашы Узброеныя Сілы фактычна ўяўляюць сабой адзіны арганізм.

Але ж... Было б перабольшваннем сказаць, што перспектывы Саюзнай дзяржавы зусім бязвоблачныя. Не зусім зразумела, якое месца яна ў выніку зойме ў агульнай сістэме інтэграцыйных супольнасцяў (Мытны саюз, Адзіная эканамічная прастора і асабліва Еўразійскі саюз, што павінен стартаваць у 2015 годзе). Па-ранейшаму нявырашанымі застаюцца многія пытанні, у тым ліку тыя, што датычацца і простых грамадзян. Самы відавочны прыклад — паступленне ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. У Беларусі абітурыенты здаюць тэсціраванне, у Расіі — адзіны дзяржаўны экзамен. Суседняя краіна далучылася да Балонскага працэсу, мы — не і г.д. Гэтыя пытанні і іншыя больш складаныя, патрабуюць хуткага вырашэння.

Увогуле, для любой справы неабходны важныя знакавыя перспектыўныя задачы, інакш яна замаруджваецца, губляе сваю прывабнасць для людзей. Тое самае тычыцца і Саюзнай дзяржавы. Ужо некалькі гадоў няма ніякіх новых буйных праектаў, праграм. Хочацца параіць тым палітыкам, якія займаюцца «прасоўваннем» інтэграцыі паміж нашымі краінамі, наступнае: не саромейцеся ставіць амбіцыйныя мэты — жыццё іх спраўдзіць.

**У свеце.** І зноў расійскі кірунак.Уладзімір Пуцін выступіў з заявай, якую ад яго, мабыць, ніхто не чакаў.

У сераду, 3 красавіка ў час сустрэчы з кіраўніком «Газпрама» Аляксеем Мілерам прэзідэнт Расіі даручыў адпрацаваць пытанне па будаўніцтве трубаправода «Ямал-Еўропа-2» — гэта значыць, па тэрыторыі нашай краіны. На што Аляксей Мілер адказаў: «Сёння транзіт праз тэрыторыю Беларусі па газаправодзе «Ямал-Еўропа-1» з'яўляецца для нас самым эканамічна эфектыўным. Газатранспартная сістэма цяпер знаходзіцца ва ўласнасці «Газпрама», і для нас самым эфектыўным з пункту гледжання лагістыкі з'яўляецца менавіта гэты маршрут пастаўкі газу нашым еўрапейскім спажыўцам».

Што азначае гэтая размова? Адразу загучалі галасы скептыкаў, нібыта Беларусь нічога не атрымае ад новага трубаправода менавіта таму, што ён будзе знаходзіцца поўнасцю ва ўласнасці «Газпрама». Наўрад ці можна з гэтым пагадзіцца. «Белтрансгаз», які быў прададзены нашай дзяржавай расійскай кампаніі на вельмі выгадных умовах, плаціць падаткі ў Беларусі. Будаўніцтва чарговага трубаправода прывядзе да стварэння новых рабочых месцаў, інвестыцый у нашу эканоміку. Так што карысць Беларусі тут відавочная.

Праўда, на наступны дзень пасля прапановы Уладзіміра Пуціна прагучаў голас афіцыйнай Варшавы. Міністр дзяржаўнай казны Мікалай Будзаноўскі заявіў, што Польшча не надта зацікаўлена ў новым праекце і шукае іншых пастаўшчыкоў газу. Што ж, гэта права польскага боку. Але пакуль тыя пошукі не далі добрага плёну, і Польшча як была залежнай ад Расіі, так і застаецца.

І справа не толькі ў Польшчы. Расійскі газ па новым трубаправодзе змогуць атрымліваць таксама Венгрыя і Славакія. Насцярожанасць Польшчы цалкам зразумелая: рэалізацыя новага праекта значна павялічыць уплыў Расіі ў рэгіёне і зменшыць шанцы Захаду разбурыць інтэграцыйныя сувязі, якія існуюць паміж Мінскам і Масквой. Аднак тут паўстае такое пытанне: а ці не наспеў час для Варшавы забыцца на свае імперскія комплексы, змірыцца з тым выбарам, які зрабілі ў Беларусі і Расіі, і проста будаваць добрасуседскія адносіны? Ад гэтага выйграюць усе, ужо без усякай прывязкі да расійскага газу.

**З гісторыі.** Кажуць, што 1 красавіка як свята смеху (альбо Дзень дурняў) мае глыбокія карані. Верагодна так. Але дакладна, што ў XVI стагоддзі ў Вялікім Княстве Літоўскім яго не адзначалі. Таму Жыгімонт Аўгуст быў зусім сур'ёзным і не думаў жартаваць, калі 1 красавіка 1557 года падпісваў знакамітую «Уставу на валокі».

Што звычайна цікавіць людзей у гісторыі? Героі і зладзеі, неверагоднае каханне, войны, інтрыгі. Гаспадарчыя справы наўрад ці прываблівають звычайнага чалавека. І дарма, бо менавіта яны і складаюць галоўную частку гістарычнага працэсу. Ва ўсялякім разе нашых продкаў яны займалі значна больш, чым каханне Барабары Радзівіл альбо прыдворныя інтрыгі ў Вільні.

«Устава на валокі» стала сапраўднай гаспадарчай рэвалюцыяй для свайго часу. Сам дакумент быў не чым іншым, як інструкцыяй, у адпаведнасці з якой павінна была праводзіцца рэвізія парадку землекарыстання ў ВКЛ — перагляд папярэдняй «памеры», якую правяла ў сваіх уладаннях каралева Бона Сфорца.

На першы погляд, не адбывалася нічога значнага. Проста старая сістэма землекарыстання рэарганізоўвалася праз увядзенне ў дзяржаве асноўнай адзінкі абкладання — валокі, што складае 21,36 га, а таксама вызначэнне якасці глебы. Таму і ўся рэформа атрымала назву «валочнай памеры».

На самой справе тое, што адбывалася ў сярэдзіне XVI стагоддзя, мела велізарнае значэнне і па сваіх наступствах можа быць суаднесена толькі з калектывізацыяй у XX стагоддзі.

У выніку феадалы выціснулі простых сялян на менш ураджайную зямлю, а ў сябе стварылі вялікія ўгоддзі — фальваркі. Адпаведна ўзраслі і павіннасці сялян: паншчына, асада і талака. Асабліва цяжкай была паншчына, якую трэба было адпрацоўваць на землях шляхціцаў і магнатаў — ад двух да пяці дзён на тыдзень.

Фактычна «Устава на валокі» значна ўмацавала прыгоннае права на Беларусі, якое было потым канчаткова аформлена Статутам ВКЛ 1588 года. Так што, як бы мы ні ставіліся да 1 красавіка, але ў гісторыі здараліся не толькі вясёлыя падзеі.

gigin@belta.by

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**здание холодильных камер,**
**общей площадью 277.8 кв.м (инв. № 600/С-42),**
**здание склада,**
**общей площадью 944.6 кв.м (инв. № 600/С-43),**
расположены на земельном участке площадью **1,0806 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Минский район, район деревни Паперня.**

**Начальная цена с НДС – 2 034 000 000 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (203 400 000 бел. руб.) перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

Аукцион состоится **22.05.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.05.2013** до 12.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні памочніку Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы, прэс-сакратару Алене Аляксандраўне Аўчарэнцы ў сувязі з вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ЭНЕРГЕТЫКА РОДНАГА СЛОВА

**Лепшы настаўнік Магілёўскай вобласці выкладае беларускую мову і літаратуру.**



Юрый Каласоўскі з Магілёўскай гарадской гімназіі № 1 стаў пераможцам рэгіянальнага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года — 2013».

Калісьці Юрый вучыўся ў хіміка-тэхналагічным тэхнікуме, дзе з цікавасцю стаў браць удзел у алімпіядах па беларускай мове і літаратуры. Таму неўзабаве прамяняў электраэнергетыку на філалогію і пасля заканчэння ўніверсітэта ўжо па новай спецыяльнасці стаў настаўнікам. У гімназіі № 1 працуе шосты год, імкнецца выхаваць у вучнях павагу да роднай мовы і літаратуры.

— Гарадскія дзеці, вядома, па-за ўрокамі не размаўляюць па-беларуску, — кажа Юрый. — Але ставяцца да роднага слова прыхільна. Мне здаецца, што маладыя людзі разумеюць, што гэта каштоўнасць, якую трэба мець і ведаць.

Настаўнік Каласоўскі шмат вандруе па Беларусі, і таму на сваіх уроках робіць для вучняў падарожжа ў прасторы і часе: мову і літаратуру дапаўняе цікавымі звесткамі па геаграфіі і гісторыі краіны. Юрый таксама рэдагуе гімназічную газету, дзе шмат артыкулаў менавіта на беларускай мове. Ён — актыўны сябра Таварыства беларускай мовы.

Увогуле ў абласным конкурсе «Настаўнік года» бралі ўдзел 23 педагогі з розных куткоў рэгіёна. Яны правялі ўрокі ў незнаёмых класах, дэманстравалі журы свае педагагічныя прыёмы. Каласоўскаму дапамаглі стаць пераможцам курс «Магілёвазнаўства» (атрымалася віртуальная экскурсія па абласным цэнтры), а таксама выкарыстанне тэхналогіі актыўнай ацэнкі. Юрый скарыстаў польскі вопыт, калі дзеці бяруць удзел у ацэнцы сваёй працы на ўроку.

— Я думаю, што самае галоўнае для настаўніка — не спыняцца да дасягнутым, развівацца разам са сваімі вучнямі, — сказаў лепшы настаўнік года ў Магілёўскай вобласці. — Тут вельмі дарэчы лацінскі афарызм «Docendo discimus» — навучаючы, вучымся самі.

**Ілона ІВАНОВА.**

■ Будзь у курсе

# ЯК ПЛАЦІЦЬ ЗА ДАРОГУ — СПЫТАЙ У СПЕЦЫЯЛІСТА

**Пра ўсё, што датычыць аплаты праезду па беларускіх дарогах, цяпер можна даведацца больш падрабязна. У Нацыянальнай электроннай сістэмы збору платы за праезд па аўтамабільных дарогах Беларусі BelToll, якая пачне працаваць з 1 ліпеня, з'явілася служба інфармацыйнай падтрымкі. Акрамя таго, афіцыйны сайт сістэмы стаў даступным для карыстальнікаў.**

Спецыялісты call-цэнтра патлумачаць, напрыклад, як працуе сістэма, і раскажуць пра тыя транспартныя сродкі, для якіх аплата за праезд абавязковая. Яшчэ аператары дапамогуць даведацца ўсё пра ўстаноўку спецыяльнага бартавога прыстасавання і праінструктуюць, што ж рабіць, калі раптам яно згубілася ці было ўкрадзена. Кансультацыю можна атрымаць на чатырох мовах: беларускай, рускай, польскай і англійскай.

Тэлефанаваць варта ў будныя дні з 8.00 да 18.00 па нумары +375 (172) 798 798. Напярэдадні пачатку працы сістэмы збору платы за праезд, з 1 чэрвеня, акурат за месяц да гэтай падзеі, працу інфармацыйнай службы збіраюцца зрабіць сямідзённай і кругласутачнай.

Плаціць за праезд па дарогах Беларусі праз сістэму BelToll будзе абавязковым для кіроўцаў легкавых аўтамабіляў, зарэгістраваных за межамі Мытнага саюза (у тым ліку пасажырскіх мікрааўтобусаў) з тэхнічна допушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 т. Таксама браць плату збіраюцца з кіроўцаў іншых транспартных сродкаў (грузавікоў, аўтобусаў, дамоў на калёсах) з тэхнічна допушчальнай агульнай масай больш за 3,5 т.

Бартавое прыстасаванне, з дапамогай якога будзе ажыццяўляцца збор платы за праезд, уяўляе сабой невялічкі прыбор, падобны да навігатара. Прыбор усталёўваецца на лабавое шкло аўтамабіля, патрэбная сума спісвацца аўтаматычна, калі машына праязджае пад спецыяльнымі станцыямі, размешчанымі над дарогай. Аплата будзе весціся ў беларускіх рублях, зыходзячы з тарыфаў у еўра па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка. Паступова платнымі стануць усе дарогі, што звязваюць сталіцу з абласнымі цэнтрамі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■ Беларусь і свет

# ПАРТНЁРСТВА Ў НОВАЙ СФЕРЫ

**Як надаць моцны імпульс развіццю супрацоўніцтва Беларусі і В'етнама ў перспектыўнай для абедзвюх краін сферы турызму? Днямі на гэту тэму адбылася грунтоўная размова ў Мінску ў Доме дружбы. Пад яго дахам сабраліся прадстаўнікі беларускіх і в'етнамскіх турыстычных фірмаў, дыпламаты, журналісты.**

В'етнамскія суразмоўцы (сярод іх былі пасол у Беларусі До Ван Май, гендырэктар вядомай у свеце турыстычнай кампаніі «Эра Група» Фам Суан Нят) адзначалі, што турызм у іх краіне ўжо з'яўляецца важным сегментам нацыянальнай эканомікі, ён адна з істотных крыніц рэгулярных паступленняў замежнай валюты ў дзяржаўны бюджэт. Тэмпы росту развіцця турыстычнай галіны ўражваюць. Вось некаторыя лічбы. Яшчэ параўнальна нядаўна колькасць наведнікаў В'етнама не перавышала некалькіх тысяч іншаземцаў. Але, дзякуючы прынятым на дзяржаўным узроўні захадам, сітуацыя кардынальна змянілася. У 2008 годзе В'етнам наведала 4,2 млн турыстаў. У 2011 годзе ўжо каля 6 млн, што на 1 млн больш, чым у 2010 годзе. І, відаць па ўсім, роля і значэнне ўязнога турызму для в'етнамскай эканомікі будзе толькі ўзрастаць. Да 2015 года в'етнамцы разлічваюць ужо прымаць 8-9 млн турыстаў. Зразумела, для дасягнення гэтага спатрэбяцца вялікія інвестыцыі. І яны ідуць у краіну.

Нагадаем, эканоміка В'етнама паступова рухаецца ў бок развіцця сектара паслуг, які прыносіць краіне больш за трэць валавога ўнутранага прадукту. Турызм (асабліва будаўніцтва гатэляў) займае трэцяе месца па прыцягненні інвестыцый пасля цяжкай прамысловасці і гарадскога развіцця. Эксперты заўважаюць, што нам варта ўважліва прыгледзецца да досведу і поспеху В'етнама ў засваенні міжнароднага турызму, актыўней супрацоўнічаць з в'етнамскімі фірмамі ў справе рэалізацыі ўзаемнавыгадных праектаў. Напрыклад, арганізацыі тураў для в'етнамцаў у Беларусь, а з яе ў іншыя суседнія краіны. Дарэчы, такі падыход выкарыстоўваюць многія в'етнамскія турыстычныя фірмы. Яны арганізоўваюць паездкі ў Лаос, Камбоджу, М'янму і інш. Ёсць нагода дакладна вывучыць, чаму ўязны турызм у В'етнаме за непрацяглы тэрмін дасягнуў высокіх эканамічных паказчыкаў, а турыстычныя прадукты і паслугі знаходзяцца на ўзроўні міжнародных стандартаў.

**Леанід ТУГАРЫН**

Любую, дарагую нашу Ядзвігу Іванаўну СІВУЮ з в. Петрашунцы Валожынскага раёна віншуем з 85-годдзем! Зычым шчасця табе зямнога, радасці — каб не злічыць! Здароўя жадаем многа. І доўга яшчэ пажыць!
**Дзеці, унукі і праўнукі.**

# «Лянівыя старэюць раней!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Вось ужо пяты год** я праводжу рэспубліканскі конкурс «Каралева фітнэсу Беларусі». Яго ўдзельніцы — звычайныя беларускі, якім ад 21 да 40 гадоў. Я хачу паказаць гэтых жанчын (сярод іх шмат маладых маці), якія вядуць здаровы лад жыцця, умеюць захоўваць прыгажосць, — усёй краіне. Бо ўсё ўзаемазвязана: жанчына перастае сачыць за сабой — зніжаецца самаацэнка, пачынаюцца праблемы ў сям'і, на працы. Многія пасля конкурсу падыходзяць і кажуць: «Дзякуй, у мяне павысілася самаацэнка. Мае родныя сталі па-іншаму ставіцца да мяне».

**Калі жанчына ў 40 гадоў** выглядае на ўсе 60, значыць, яе ўсё задавальняе. Плыве па жыцці, як шчэпка: што ёсць — тое ёсць. Лянівыя людзі, якія нічога ў жыцці не хочуць мяняць, старэюць раней. Калі ўжо зрабіць практычна нічога немагчыма, тады яна апомніцца, нешта захоча змяніць, але не зможа. Не трэба даводзіць сваё цела, сваю псіхалогію да кропкі незвароту, да таго стану, калі ты глядзіш на сябе ў люстэрка і думаеш: «Ай, мне і так добра».

**Заўсёды паўтараю:** калі табе няма чым заняцца, займіся сабой! Як? У каго ёсць магчымасць, пойдзе ў салон прыгажосці. У каго яе няма, можа выкарыстоўваць падручныя сродкі. Варыць жанчына клубнічнае варэнне — з двух-трох ягад можна зрабіць маску для твару. Галоўнае — любіць сябе, клапаціцца пра сябе.

## УРОК ТРЭЦІ: ешце не больш, чым хочаце

**Мы харчуемся абсалютна няправільна.** У дзіцячым садку — першае, другое, трэцяе і... кампот. Нельга прымушаць дзяцей есці ўсё гэта адразу. Порцыі ў нас вельмі вялікія. Мы з дзяцінства «разбіваем» страўнік. Чалавек прызвычайваецца нават візуальна, што талерка павінна быць «з горкай». І трэба ўсё даесці. Гэта лічыцца добрым тонам. Насамрэч чалавек павінен есці столькі, колькі хоча і калі хоча. У кожнага з нас ёсць як свой час тварыць і свой час любіць, так і свой час есці. Калі чалавек лішні раз нешта не з'еў, паверце мне і майму вопыту, арганізм знойдзе ўнутраныя сілы і мабілізуецца.

**Тоўстыя людзі,** якія ёсць і ў Амерыцы, і ў нас, — гэта, як правіла, людзі, у каго жыццё абмяжоўваецца працай і домам. Пасля працы хутчэй да стала, да смачных катлет і галубцоў. Пасля галубцоў на канапу — і ўсё. І жыццё ідзе па крузе. А калі ты прыбягаеш дадому і ў цябе праз гадзіну сустрэча ці прэзентацыя, калі ты ўвесь час нечым заняты, то цэнтр жадання паесці падаўляецца.

**Пахудзець на тры кілаграмы** за тры дні цалкам рэальна, пасядзеўшы на вадзе ці агурках. А пасля, вярнуўшыся да звычайнага рэжыму харчавання, набраць усе 4. Таму што арганізм не разумее, за што яго пазбавілі ежы. І ў страху, што вы яго зноў пасадзіце на галодны паёк, пачынае рабіць запасы. Усе экспрэс-методыкі ўкладваюцца ў адну схему: яны даюць хуткі вынік і вельмі непрыемныя наступствы. Каб назаўсёды пазбавіцца ад 3 лішніх кілаграмаў, неабходна цалкам перагледзець свой рацыён, які з узростам абавязкова трэба карэкціраваць.

**Калі б апошнія 5 гадоў** я харчавалася так, як гадоў у 30, то цяпер бы перад вамі сядзеў чалавек недзе на 50 кілаграмаў цяжэйшы. Ужо шмат гадоў я не ем смажанага, бульбы, хлеба. А вось ад салодкага не адмаўляюся: у мяне пастаянна ёсць з сабой пакет курагі, пакет чарнасліву. Хто мне скажа, што курага не салодкая?



«Аднойчы мне прысніўся сон, што я мужчына. Прачнулася тады ў халодным поце. Абмацала сябе і думаю: «Дзякуй, Божа, я — жанчына». Не ведаю, як гэта быць мужчынам. Але магу сказаць, што мне вельмі падабаецца быць жанчынай».



**Чалавек ёсць тое, што ён есць.** Ад ежы залежыць і адценне скуры, і стан валасоў, і позірк. Нашаму арганізму ў першую чаргу патрэбны вугляводы, шмат садавіны і агародніны; пасля ў табліцы неабходных прадуктаў стаяць марскія і толькі на апошнім месцы — мяса.

**Я — за здаровае харчаванне.** Адношу сябе да вегетарыянцаў. Знаходжуся на шляху да сыраядзення. Калі ўдаецца правесці хоць бы тыдзень на сырых прадуктах, адчуваю сябе лёгка, цудоўна.

## УРОК ЧАЦВЁРТЫ: хочаш надзець кароткую спадніцу — надзень

**Калі ў мяне пытаюцца пра ўзрост,** кажу, што мне два разы па 25. Я свайго ўзросту не адчуваю, ён мяне не напружвае, не турбуе. Проста ведаю, што ў мяне свой ход часу. Ёсць зямны час, а ёсць мой унутраны, біялагічны. Біялагічны ўзрост — гэта справа сур'ёзная.

**Захапляюся**, калі бываю за мяжой і бачу, як 70-гадовыя дзядулі і бабулі ходзяць, узяўшыся за рукі, прыгожа апранаюцца, танцуюць і цалуюцца. І паспрабуй скажы, што яны старыя! Трэба проста разумець, што жыццё даецца адзін раз. Хочаш надзець кароткую спадніцу — надзень, хочаш праспяваць у парку — наперад!

**Поспех, грошы, бізнес — гэта,** безумоўна, цудоўна. Але без кахання — ніяк. Менавіта яно нас усіх сілкуе. Я адбылася як маці. У мяне цудоўны сын. Сама шмат працавала і змагла рэалізаваць сябе ў справе. А для любімага чалавека хачу быць цікавым раманам з працягам, а не заставацца прачытанай кнігай на паліцы...

## УРОК ПЯТЫ: здзяйсняецца адна мара — трэба тут жа «ўключаць» другую

**Пачынала з таго,** што хадзіла па дзіцячых садках і прапаноўвала правесці ўрокі для бацькоў і выхавацеляў: у абедзенны перапынак спартыўная зала, як правіла, пустуе. У адной руцэ — спартыўная сумка, у другой — мяч, магнітафон — пад пахай... Але на той момант я была настолькі апантаная сваёй ідэяй...

**Свой клуб адкрыла пасля паездкі** з мужам у Швейцарыю да сябра. Ён быў уладальнікам вялікага спартыўнага комплексу. Я дзеля цікаўнасці схадзіла туды на заняткі. І зразумела: па спартыўнай падрыхтоўцы дам 10 ачкоў наперад любому з яго трэнераў.

**Усё галоўнае ў нас у галаве.** Калі чалавек нешта задумаў, вельмі моцна верыць і пры гэтым не сядзіць склаўшы рукі, то ў яго ўсё атрымаецца. І чым цяжэй нешта даецца, тым большую асалоду пасля атрымліваеш. Спаўняецца адна мара — не трэба ні ў якім разе спыняцца, трэба тут жа «ўключаць» другую! Трэба любіць жыццё, тады яно абавязкова адкажа ўзаемнасцю!

**Працалюбства**, як і пачуццё прыгожага, мне прывілі бацькі. Тата быў канструктарам-мадэльерам мужчынскага адзення, мама — жаночага. У сям'і трое дзяцей. Бацькам даводзілася браць дадатковыя заказы, каб падняць нас на ногі. Ночы напралёт страчыла швейная машынка... Не дзіўна, што мы былі апрануты больш стыльна, чым іншыя дзеці.



## УРОК ШОСТЫ: цаніце здароўе, пакуль нічога не баліць

**Гадоў дваццаць таму** я займалася ўсяго гадзіну ў дзень, і гэтага было дастаткова. Але з узростам нагрузку даводзіцца падвойваць: па законах біялогіі з часам мышцы губляюць сілу і пругкасць, і даводзіцца прыкладаць усё больш намаганняў, каб падтрымліваць іх у тонусе.

**Займацца спортам прымушае** не сіла волі, а любоў і павага да сябе. Я не хачу ведаць, што такое астэахандроз і боль у паясніцы, не хачу прымаць таблеткі — гэта лепшы стымул для трэніровак. Зрэшты, я таксама не жалезная лэдзі і часам магу прапусціць занятак. Магу цэлы дзень прасядзець дома: чытаць кнігу, глядзець тэлевізар. Іншая справа, што маё «ай» не расцягваецца на гады, як у многіх, а доўжыцца ўсяго дзень-два.

**Пакуль у нас нічога не баліць,** мы не цэнім сваё здароўе. Бо яно даецца нам бясплатна, і мы карыстаемся ім на ўсю катушку. Мы яго марнуем і направа, і налева, пакуль органы не пачынаюць здаваць. Таму інстынкт здаровага ладу жыцця трэба прышчапляць з дзяцінства. Гэта і ранішняя зарадка, і сумесныя сямейныя прагулкі на веласіпедах, паходы. Дзеці павінны браць прыклад з бацькоў, пакуль спорт не стане часткай жыцця.

**Урок фізкультуры ў школе,** лічу, павінен праходзіць кожны дзень. Падчас вялікага перапынку, як у Кітаі, — усіх у залу. Неабавязкова рабіць стандартную зарадку, можна правесці размінку ў даступным і сучасным стылі, блізкім дзецям. Напрыклад, развучыць пад музыку 2 рухі з хіп-хопу. Чаму б не правесці эксперымент, не паглядзець, што з гэтага атрымаецца? Магчыма, дзеці ахвотней хадзілі б у школу, лепш вучыліся і былі больш здаровымі. Калі б нейкая школа згадзілася, я з задавальненнем вяла б такую 20-хвілінную размінку.

## УРОК СЁМЫ: не жыві ўспамінамі — на гэта ў цябе ўся старасць. Ствары ўспаміны!

**Спорт — гэта...** маё жыццё. Але, акрамя спорту, у мяне ёсць шмат іншых захапленняў: займаюся жывапісам, люблю фатаграфаваць. Мне падабаецца пісаць прозу. Падрыхтавала кнігу вершаў. Думаю, што вясной я яе выдам. Пераключаючыся з адной справы на другую, я амаль не стамляюся. І чаканне наступнага дня не навальваецца на мяне цяжкай ношай. Кажуць, старыя жывуць успамінамі. Маладосць жыве марамі. Дык вось у мяне ўвесь час з'яўляюцца новыя мары. І гэта мяне амалоджвае.

**Мару стварыць** Нацыянальную школу фітнэсу. Разумею, што без дапамогі дзяржавы мне гэта не па сілах. Калі будзе магчымасць сустрэцца з новым міністрам, з кіраўніком дзяржавы, абавязкова ўздыму гэта пытанне.

**Яшчэ мне вельмі хочацца** пражыць хаця б да 115 гадоў. Мару ўбачыць не толькі сваіх унукаў, але і праўнукаў. Нават прыдумала назву людзей, якія будуць жыць больш за 100 гадоў. Бо «чалаВЕК» — будзе ўжо неактуальна. А вось «чалаДОС», а маленькія «чалаДОСікі» — самае тое, бо «дос» па-іспанску — гэта два. Назва павінна ўкараніцца ў галаву чалаВЕКа праграму, што ён жыве не 1, а 2 вякі. Я нават планую стварыць сайт, дзе б мяне падтрымалі людзі, якія лічаць, што можна пражыць 100 гадоў і не ў інваліднай калясцы, не маразматыкам, а здаровым, вясёлым, творчым.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

## Ад аўтара

***Напрыканцы размовы Наталля Наважылава папрасіла дапамагчы сабраць відэазапісы «Урокаў Наталлі Наважылавай», якія на працягу 7 гадоў трансляваліся па тэлебачанні. Бо вялікая частка праграм страчана, нешта з гадамі адсырэла, нешта рассыпалася... Магчыма, сярод звяздоўцаў ёсць тыя, хто глядзеў праграму, хто займаўся пад гэтыя відэатрансляцыі. Калі ў некага нейкія запісы засталіся, яна з задавальненнем на любых умовах іх выкупіла б.***

# ПАГРЭЙЦЕСЯ, ЖАВАРОНАЧКІ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*Жавароначкі, прыляціце!*
*Вясну красную прынясіце!*
*А зімачку забярыце,*
*Бо зімачка надаела,*
*Усе хлебушкі пераела...*

Старэйшая жыхарка вёскі Ганна Батан нават праз шчыльна зачыненыя вокны пачула песню-вяснянку, убачыла гурт дзяцей, якія дружна клікалі:

«Баба Ганна, выходзь жаваронкаў страчаць!» .

«От і дачакалася», — узрадавалася Ганна Станіслаўна, узяла міску з выпечанымі птушачкамі і рушыла на вуліцу.

Птушак яна выпякла напярэдадні ўвечары, бо ў свята нельга працаваць. «Птушка гнязда не ўе, дзеўка касу не пляце»,— кажуць у народзе.

— Некалі мы расчэсваліся на ноч, завязвалі галовы хусткамі і клаліся спаць — гэтак строга прытрымліваліся звычаяў, — прыгадвае старэйшая жыхарка.

Дабравешчанскай раніцай, яшчэ да прыходу дзяцей, памаліўшыся, баба Ганна схадзіла на скрыжаванне, павесіла на крыж вышыты ўласнымі рукамі ручнік.

Ля брамкі яе падворка нецярпліва чакалі хлопчыкі і дзяўчаткі — яны трымалі за ражкі чырвоную хустку — для пачастункаў. У хустку баба Ганна паклала і сваіх жаваранкаў.

— А ну, патапчыце снег, каб вясна хутчэй прыйшла! — закамандавала гаспадыня.

Дзеці затупалі па апошнім снезе, прыгаворваючы, як замову, тры разы:

*Ой, топчам мы, ой топчам мы,*
*А што ж мы*
*да вытапчам?*
*А ці снегі з лёдам?*
*А ці зіму з марозам?*
*Ой, не зіму*
*з марозам,*
*А цяпленьку*
*вясненьку!..*



Надзеўшы «жаваранкаў» на дубчыкі, забалацкія вястуны пабеглі ў наступны двор, да бабы Тані, — Таццяны Паўлаўны Данілевіч. А потым на чырвонай хустцы гушкаліся жаваранкі ад бабы Валі і бабы Наталлі — Валянціны Адамаўны Драбудзькі і Наталлі Дзмітрыеўны Шалыгінай. Гэтак заведзена, што дзяцей частуюць менавіта бабулі.

Ад скрыжавання даносіліся карагодныя песні, па якіх няцяжка было здагадацца, што выводзяць іх старэйшыя забалацкія дзяўчаты:

*Вол бушуе — весну чуе,*
*Воран крача — сыру хоча.*

*Воран крача, сыру хоча,*
*Дзеўка плача, замуж хоча.*

*Не крач, воран, нажарэшся!*
*Не плач, дзеўка, нажывешся!..*

Шырокі, на ўсё скрыжаванне, карагод утварыўся з дзявочых гуртоў, якія сышліся сюды з іншых пасёлкаў. Рух карагоду ідзе па сонцы. У цэнтры ў супрацьлеглы бок свой карагод вядзе малеча — у яе руках дубцы з «жаваранкамі». Сваімі танюсенькімі галасочкамі дзеці ўліваюцца ў прыгожае вясновае шматгалоссе: гу-г-г...

А потым усе бягуць на высокі пагорак пад бярозу — раскладваць агонь, куляцца з гары праз галаву, вешаць на галінкі дрэва папяровых птушак. Пакуль хлопцы носяць кастрыцу і дровы, намагаюцца распаліць вогнішча, дзяўчаты развітваюцца з прадзівам, кідаючы на бярозавыя галінкі кавалачкі кудзелі, прыгаворваючы: «Каб болей пальчыкі не калола, вечарочкі не караціла». Як вядома, з пачатку Вялікага посту прасці ў сялянскіх хатах пераставалі — наступаў час садзіцца за кросны. Пра гэта сведчыць адна з песень-вяснянак:

*Да ўжэ вясна прыйшла, вясна.*
*Да чужые людзі ткуць кросна,*
*А я, маладзенька, не прала,*
*Пад лёд кудзелькі пускала.*

*Плывеце, кудзелькі, валакном,*
*Ка мне маладзюсенькай — палатном...*

Утыркнуўшы дубчыкі вакол агню, дзеці «грэюць» сваіх «жаваранкаў» і самі грэюцца ля полымя. Большыя гуляюць у «Явар» і «Проса», дзяўчаткі кідаюць на бярозу сыр — каб птушкам было чым сілкавацца, калі вернуцца з выраю. Прыгубіўшы з лыжкі віна, моладзь пачынае перагукванне — кожны гурт спявае толькі адзін куплет сваёй загукальнай ці карагоднай песні, а атрымліваецца бясконцы песенны ланцужок.

Сёлета пагукаць вясну ў Забалаць прыехала моладзь з суседніх вёсак Обчын і Дарасіно — таксама спеўных і па-свойму адметных. Таму дабравешчанскае перагукванне было афарбавана асаблівасцямі выканальніцкіх манер гэтых мясцін. Дырэктар Забалацкага СДК Алена Галадок загадзя паклапацілася, каб Дабравешчанне ў вёсцы, нягледзячы на яшчэ моцна заснежаныя палеткі, адсутнасць птушак і скупое сонейка, стала прыгожай падзеяй, радаснай для ўсіх вяскоўцаў — ад старых да малых, добрым напамінам пра спадчыну ад бабуль і прабабуль.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Любанскі раён.*



Вясковы пенсіянер Марат Аляксеевіч Шпіленя, не забываючы мудрыя звычаі дзядоў-прадзедаў, дастаў прыхаваны з восені замок і адамкнуў яго. Павінен жа нехта нарэшце на Дабравешчанне адамкнуць матухну-зямлю.





## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 апреля 2013 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества ОАО «Белпромтара»

| Номер предмета торгов | 2 |
|---|---|
| Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов) | - «Административно-бытовой корпус» общей площадью 1497 кв. м, инв. номер 500/С-27557;<br>- «Производственный корпус» общей площадью 2217 кв. м, инв. номер 500/С-27583;<br>- «здание гаража» общей площадью 156 кв. м, 500/С-27553;<br>- «Склад готовой продукции» общей площадью 370 кв. м, инв. номер 500/С-8548;<br>- «Н 1/М Навес» общей площадью 697 кв. м, инв. номер 500/С-27578;<br>- «лит. В1/к, Г 1/к Производственный корпус с навесом» общей площадью 791 кв. м, инв. номер 500/С-27582 (площадь навеса 157 кв. м);<br>- «Резервуар для воды», инв. номер (бухг.) 169;<br>- «Ворота» общей площадью 10,58 кв. м, инв. номер (бухг.) 280;<br>- «Забор кирпичный» протяженностью 26 м, инв. номер (бухг.) 281 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Забор железобетонный» протяженностью 185 м, инв. номер (бухг.) 281 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Ограждение сеточное» протяженностью 25 м, инв. номер (бухг.) 146 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Канализация», инв. номер (бухг.) 158, (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Ливневая канализация», инв. номер (бухг.) 159 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Водопровод», инв. номер (бухг.) 156 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Теплотрасса наружная», инв. номер (бухг.) 143;<br>- «Стоянка автомобильная», инв. номер (бухг.) 147;<br>- «Площадка асфальтовая» общей площадью 691,3 кв. м; инв. номер (бухг.) 145 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Наружное освещение» (кол-во светильников – 9 шт.), инв. номер (бухг.) 153;<br>- «Сети электроснабжения» протяженностью 230 м (часть, относящаяся к предмету торгов № 2), инв. номер (бухг.) 154;<br>- «Внеплощадочные сети электроснабжения», инв. номер (бухг.) 155;<br>- «Сети электроснабжения», инв. номер (бухг.) 157 (часть, относящаяся к предмету торгов № 2);<br>- «Зеленые насаждения» (деревья) 34 шт.;<br>- «Зеленые насаждения» (кустарник) 3 шт.;<br>- «Зеленые насаждения» (цветник) 10 кв. м;<br>- «Зеленые насаждения» (газоны) 4238 кв. м. |
| Сведения о земельном участке | площадь – 1,6581 га, кадастровый номер 500000000009004861 |
| Местонахождение продаваемого имущества | г. Минск, пер. Твердый 1-й, 7 |
| Сведения о продавце | ОАО «Белпромтара», 1-й Твердый пер., 7, 220037, г. Минск |
| Сведения об организаторе торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| Начальная цена предмета торгов | 22 872 898 560 белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2 000 000 000 белорусских рублей |
| Наличие обременений | аренда, залог, наличие совместного проезда |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Белпромтара», утвержденным организатором торгов.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата вознаграждения за организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (покупателем) помимо оплаты стоимости приобретенного имущества.

Торги проводятся 30 апреля 2013 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 09.04.2013 по 26.04.2013 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 291-83-10, (029) 636-15-22.**

## ОАО «Нафтан»

**реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

- Киноиспытатель «Ксенотест 450 LF», дата выпуска 1983 г., дата ввода в эксплуатацию 1987 г., начальная цена – 60 550 800 белорусских рублей с НДС.

**Состояние удовлетворительное.**

**Предложения принимаются по адресу:** 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101 с пометкой «Реализация неликвидов, ксенотест» до 2 мая 2013 года.

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by** в разделе «Объявления».

**Контактные телефоны: 8 (0214) 55 78 85, 8 (0214) 55 78 66, (044) 758 08 33, (044) 553 02 59.** *УНП 300042199*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 16 мая 2013 года АУКЦИОНА

**по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Тюхиничи Мотыкальского сельского Совета Брестского района**

| № лота | Местоположение земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Целевое назначение земельного участка и его кадастровый № |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Тюхиничи ул. Лесная, 5А;** | 0,15 | 29472300 | Строительство и обслуживание одноквартирного (блокированного) жилого дома; |
| | сумма задатка, руб.; | | 2947230 | |
| | расходы на изготовление земельно-кадастровой документации, руб.; | | 4174900 | |
| | расходы на объявление в средствах массовой информации, руб. | | Согласно акту выполненных работ | |

Земельный участок расположен в д. Тюхиничи по улице Лесная, 5А. По улице проложен газопровод и построена линия электропередачи. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться 16 мая 2013 г в 10.00 по адресу: аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2-х участников.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, удостоверяющего внесение на расчетный счет Мотыкальского сельисполкома № 3600213060056 в филиале 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» код 246 г. Брест УНП 200676206 Назначение платежа 4901, залог в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), удостоверяющий личность покупателя.

Заявление для участия в аукционе принимаются по адресу: аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00ч по рабочим дням. Последний срок подачи заявления – 8 мая 2013 года до 17.00 ч.

**Контактные телефоны: 94 91 36, 94 91 35, 94 95 41**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 24 апреля 2013 года проводит 1-ый повторный открытый аукцион от 07 февраля 2013 года по продаже имущества республиканской собственности на 7-ом открытом аукционе.**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 3 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68902006 дв. 8853777 1989 г. 4 кат. 811 км | г. Старые Дороги в/ч 42747 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 4 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68902007 дв. 8850408 1989 г. 4 кат. 964 км | г. Старые Дороги в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 5 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68901001 дв. 8846341 1989 г. 4 кат. 893 км | г. Старые Дороги в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 6 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68806005 дв. 8816699 1988 г. 4 кат. 2013 км | г. Старые Дороги в/ч 42747 | 80 000 000 | 8 000 000 |
| 7 | Гусеничное шасси МТ-ЛБ из комплекса К-612-0 ш. 68902008 дв. 8905830 1989 г. 4 кат. 612 км | г. Старые Дороги в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |

Условия проведения аукциона изложены в газете «Звязда» № 30 от 15.02.2013 г.

Извещение о проведении аукциона № 1 опубликовано ранее в газете «Звязда» № 249 от 28 декабря 2012 г. и № 1 от 4 января 2013 года.

**Дополнительная информация:** имущество по лоту № 186 аукциона № 9 от 30.04.2013 г. находится в г. Гродно в/ч 51171. Извещение о проведении аукциона № 9 опубликовано в газете «Звязда» № 47 от 14 марта 2013 г. *УНП 101099370*

**ОАО «Управляющая компания холдинга «Белкоммунмаш»** уведомляет кредиторов о том, что общим собранием акционеров принято решение об уменьшении уставного фонда до 19 481 642 694 белорусских рублей. *УНП 100205408*

## Открытое акционерное общество «Миноблавтотранс»

**филиал «Автобусный парк № 4» (организатор аукциона и продавец)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ СНИЖЕНА НА 50 ПРОЦЕНТОВ**

**одним лотом объекта недвижимого имущества, расположенного по адресу: Минская область, Мядельский р-н, г.п. Свирь, улица Советская, д. 15 в составе:** здание автокассы Свирь (инв. № 633/С-10404), об. пл. 43,6 кв. м (здание одноэтажное, стены кирпичные, перекрытия железобетонные).

**Начальная цена с НДС –** 17 421 006 бел. руб.

**Земельный участок пл. –** 0,0821 га.

Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012125441010 ЦБУ № 504 ОАО «БПС-Сбербанк» в г. Молодечно, БИК 153001369 УНП 601070223 филиал «Автобусный парк № 4» ОАО «Миноблавтотранс».

Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и публикацией объявления в СМИ.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформление участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте ОАО «Миноблавтотранс» www.minoblavtotrans.by (раздел новости).

**Аукцион состоится 07.05.2013 в 14.00 по адресу:** г. Молодечно ул. Великосельская, 38. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 06.05.2013 г. до 17.00 по указанному адресу.

**Тел. (8017) 294 13 95, (80176) 77 82 10.**

## УП «Минский городской центр недвижимости»

Минский городской центр недвижимости

**сообщает о внесении в извещение о проведении 17 апреля 2013 г. открытого аукциона № 02-Сф-13 по продаже земельных участков**

в частную собственность граждан Республики Беларусь (опубликовано в газете «Звязда» от 12.03.2013 и газете «Минский курьер» от 13.03.2013) следующих изменений: позиции 2, 6 – 10 таблицы, содержащейся в извещении, изложить в следующей редакции:

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 2. | ул. Фучика, 7 (Заводской район) | 500000000002007565 | 0,0574 | 453 454 720 | 45 000 000 | 2 134 249 |
| 6. | земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район) | 500000000008005469 | 0,0754 | 883 064 750 | 90 000 000 | 2 168 213 |
| 7. | земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район) | 500000000008005076 | 0,0736 | 861 990 290 | 87 000 000 | 1 864 388 |
| 8. | земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район) | 500000000008005482 | 0,0733 | 858 469 250 | 86 000 000 | 2 168 213 |
| 9. | земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район) | 500000000008005372 | 0,0700 | 819 824 110 | 82 000 000 | 1 864 388 |
| 10. | земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой №№ 1, 3 (Советский район) | 500000000008005371 | 0,0638 | 747 211 290 | 75 000 000 | 1 864 388 |

**Телефон для справок 226-16-72.** Интернет: www.mgcn.by *УНП 190398583*

## ОАО «Амкодор – Дзержинск»

**222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19**

### Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 22 апреля 2013 г. в 15-00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, актовый зал Общества. Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14-55.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – 15 апреля 2013 г.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О результатах закрытой подписки на дополнительные акции ОАО «Амкодор-Дзержинск».
2. Об утверждении решения о выпуске акций ОАО «Амкодор – Дзержинск».
3. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Амкодор – Дзержинск».
4. О внесении изменений в устав ОАО «Амкодор – Дзержинск».
5. О заключении крупной сделки.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества от 8 апреля 2013 года.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 15 апреля 2013 г. в отделе кадров Общества с 9-00 до 16-00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

**Совет директоров ОАО «Амкодор – Дзержинск»** *УНН 600005769*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)

**извещает о проведении 13 мая 2013 года повторного открытого аукциона с понижением по продаже имущества в 11-00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Продавец | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Садовый дом площадью 82,8 кв. м с инв. №310/С-36225 на земельном участке 0,15 га | Гомельский р-н, Улуковский с/с, с.т. Ипуть-1, участок 81 | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Гомельском районном исполнительном комитете | 149 850 000 | 14 985 000 |

**Шаг аукциона -5 %.** К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 16-00 от даты опубликования настоящего извещения **по 08 мая 2013 г.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, при этом данный участник аукциона приравнивается к победителю аукциона. Победитель торгов обязан: подписать протокол о результатах аукционных торгов; согласно счету-фактуре, выписанному организатором аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, оплата которого осуществляется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет Р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912 ОКПО 02975763, УНП 400071204, ОАО «Гомельоблреклама».**

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74-17-34, 74-59-73 и на сайте gomeloblreklama.by**

**ОАО «Барановичидрев» уведомляет своих акционеров о проведении 19 апреля 2013 года внеочередного общего собрания акционеров**

**Повестка дня:**

1. О подаче в хозяйственный суд заявления о возбуждении производства по делу об экономической несостоятельности ОАО «Барановичидрев».

**Собрание состоится по адресу: г. Барановичи, пос. Восточный, 3, актовый зал заводоуправления ОАО «Барановичидрев». Начало в 12.00.**

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни в период с 12 апреля 2013 года – с 9.00 до 17.00 (перерыв с 12.30 до 13.30) в здании заводоуправления, приемная генерального директора, а в день проведения собрания – в месте проведения собрания с 11.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 11 часов до 11 часов 50 минут по месту проведения собрания при предъявлении документов, удостоверяющих личность. *УНП 200299909*

Утерянный представительством **Белгосстраха по Центральному району г. Минска** бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС № 1265454 **считать недействительным.** *УНП 101883943*

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

доводит до сведения заинтересованных лиц о продлении срока действия изменений **в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 12 по генплану» в г. Минске**, опубликованных в газете «Звязда» от 22 февраля 2013 года № 35 (27400):

Предложения согласно настоящим изменениям в проектную декларацию действуют до 01.05.2013 года. *УНП 100071325*

## Извещение о проведении повторного открытого аукциона на право заключения договора аренды нежилых помещений.

**Организатор аукциона –** РУП «Белтелеком», в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр. Машерова, 21.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

1. Изолированное помещение, нежилое помещение связи, отдельное помещение на 1-м этаже, по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 50 площадью 31,6 кв.м. Помещение обеспечено инженерными коммуникациями, требует текущего ремонта.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права – 7,9 базовых арендных величин, размер задатка – 0,79 базовых арендных величин, согласно п.8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 №150 установить коэффициент – 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

2. Аукцион состоится 24 апреля 2013 года по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком» в 10.00.

Документы на участие в аукционе по объекту: г. Белоозерск, ул. Ленина, д. 50 принимаются с «15» апреля 2013 года по «19» апреля 2013 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21, каб. № 416.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049.

Для участия в аукционе участник аукциона, в срок, установленный для приема документов:

-перечисляет задаток на с/сч 3012100110001 филиал №100 Брестское областное управление АСБ «Беларусбанк» МФО 246, УНП 201003265.

- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность, подтверждающую полномочия должностного лица, и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Важным палітычным сігналам стала заява А. Лукашэнкі, што Беларусь будзе ініцыяваць вяртанне Грузіі ў лік краін-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Падчас сустрэчы беларускага Прэзідэнта з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Грузіі ў Беларусі Д. Катарыя было падкрэслена: «Я яшчэ раз пацвярджаю, што буду ўсяляк старацца, калі Беларусь, як гэта плануецца, будзе працаваць на чале СНД у наступным годзе, каб Грузія выкарыстала і гэты шлях нармалізацыі адносін не толькі з Расіяй, але і з усімі постсавецкімі дзяржавамі, з якімі ёй трэба нармалізоўваць адносіны».

Ініцыятыва кіраўніка беларускай дзяржавы была падтрымана старшынёй Выканкама — выканаўчым сакратаром СНД С. Лебедзевым, які заявіў: «...Галасы ў падтрымку таго, што Грузіі ёсць сэнс вярнуцца ў склад СНД, загучалі на самым высокім узроўні. Пра гэта выразна заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Я дзвюма рукамі за. У нас захоўваюцца цесныя эканамічныя сувязі, якія было б лагічна развіваць у рамках Садружнасці. Калі гэта адбудзецца, мне здаецца, гэта адпавядала б інтарэсам і Грузіі, і Садружнасці ў цэлым».

Па сутнасці, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка заклаў новую аснову філасофіі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, накіраваную на фарміраванне палітыкі рэгіянальных пераваг Садружнасці.

Важнымі элементамі такой палітыкі маглі б стаць пашырэнне геапалітычнай ролі СНД у інтэграцыйных працэсах на заходнім і паўднёвым кірунках; выпрацоўка адзінага алгарытму прыняцця рашэння па пытанні запрашэння місій назіральнікаў ад рэгіянальных арганізацый для ажыццяўлення назірання за прэзідэнцкімі і парламенцкімі выбарамі ў Садружнасці; стварэнне структурнага фонду па падтрымцы нацыянальных праграм сацыяльна-эканамічнага і інавацыйнага развіцця дзяржаў — удзельніц СНД, а таксама праектаў па развіцці інфраструктуры і выраўноўванні ўзроўню жыцця ў рэгіёнах Садружнасці.

Прыняцце новага курсу можа спрыяць палітычнай, эканамічнай і гуманітарнай дыверсіфікацыі адносін паміж вядучымі рэгіянальнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі і стварэнню балансу паміж дзейнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі на постсавецкай прасторы і тымі, якія яшчэ фарміруюцца, недапушчэнню рэдукцыі ў Садружнасці, што ўкладваецца ў інавацыйную палітыка-эканамічную стратэгію, так званую Frog strategy (аналаг «стратэгіі рыўка, скачка»).

Агучаную кіраўніком беларускай дзяржавы ініцыятыву неабходна разглядаць шырэй: не ў кантэксце асобна ўзятай краіны, а ў цэлым, у аспекце трансфармацый інтэграцыйных працэсаў у свеце. Новая інтэграцыйная ініцыятыва Рэспублікі Беларусь актуальная і своечасовая, бо нацэлена на павышэнне ролі Садружнасці Незалежных Дзяржаў на міжнароднай арэне і ўнутры Садружнасці, а таксама на пераход на прынцыпова новую якасць інтэграцыйнага супрацоўніцтва — з канкурэнтаў у партнёры. Гэты пераход таксама паскорыць стварэнне тэхналагічна інтэграваных тэрытарыяльных інавацыйных кластараў, прамыслова-індустрыяльных паркаў, транспартна-лагістычных цэнтраў у рэгіёне; прадухіліць магчымае зрушэнне кіраўніцкіх функцый па развіцці інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы з адной дзяржавы ў іншую дзяржаву.

**Руслан ЕСІН, доктар палітычных навук, намеснік начальніка Упраўлення СНД і ЕўрАзЭС МЗС Беларусі.**



# Ігуменскі тракт

№ 7 (22)

■ По мястэчку

## ТУТ ПРАЦАВАЎ НА ЧЫГУНЦЫ КАРУСЬ КАГАНЕЦ

### З Лідчынай звязаны літаратурныя шляхі і Аляксандра Блока, і Францішка Багушэвіча

Даследаваць край, у якім нарадзіўся, — гэта найгалоўны мой абавязак. Чаму? Адказаць складана. Можа, па той прычыне, што душой пранікаешся да сваёй радзімы? Можа, ад таго, што ведаеш якія перашкоды чакалі яе, каб мы сёння былі шчаслівыя? Нездарма існуе і такое выказванне: «Мілы той куток, дзе перарэзаны твой пупок».

Кожны раз хачу даведацца што-небудзь новае пра маю малую радзіму (вёску Крупава) ці пра горад Ліду. Знайсці гэты скарб самому і без ніякай дапамогі — гэта выклікае невыказную асалоду і яшчэ большую прыязнасць да краязнаўства.

Горад Ліда ўтойвае шмат цікавага і нязведанага. Часам яно нават знаходзіцца на паверхні, а мы шукаем у глыбіні... Ужо другі год мне даводзіцца ўзначальваць літаратурнае аб'яднанне «Суквецце» пры рэдакцыі «Лідскай газеты», працаваць у літаратурным музеі — доміку Валянціна Таўлая. Становіцца відавочным, што Лідчына — гэта літаратурны край. Так, так! Спрачацца няма сэнсу. Тут налічваецца звыш 400 імён паэтаў і пісьменнікаў, чые жыццёвыя шляхі так ці іначай звязаны з Лідчынай: гэта тыя, хто хоць і адышоў ад нас, але пакінуў адметны след, тыя творцы, якія нарадзіліся тут, але вымушаны былі пакінуць нашы мясціны.

Свой пачатак літаратурная Лідчына бярэ з канца XVI стагоддзя, калі лідскі староста Ян Абрамовіч выдаў у Вільні ў 1598 годзе евангелістычны «Катэхізіс», у якім змяшчаецца 300 рэлігійных песень. Як бачым, літаратура прайшла праз шматгадовую «шліфоўку». Тут пабывалі асобы, вядомыя не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Праз Ліду праязджаў А.Блок. А ў свой час — і бацька А.С.Пушкіна. Тут працаваў на чыгунцы Карусь Каганец. У гэтых мясцінах нарадзілася Цётка, настаўнічаў Ф.Багушэвіч. Дырэктарам цвіковага завода быў У.Корбан. Тут жылі і працавалі Н.Тарас, В.Таўлай (апошні — у газеце «Уперад»). На Лідчыне значны след пакінуў і Я.Купала. Тут нарадзілася першая беларускамоўная паэтэса Адэля з Устроні. Родам з Лідчыны В. Праўдзін, Х. Лялько, І. Багдановіч і шмат хто яшчэ.

У Лідзе прыпыняўся і сёлетні юбіляр Максім Гарэцкі. Аб гэтым ён афіцыйна пазначыў у вядомай нам кнізе-аўтабіяграфіі «Камароўская хроніка». У трэцяй частцы, пад гадамі 1917-1921 гг. пісьменнікам адзначаны год «1920». У гэтым годзе падчас ваенных дзеянняў, паводле захаваных звестак з «Пракопавага дзённіка», ёсць запісы ўжо пра гродзенскія мясціны. Перадаю ў арыгінале, але скарочана.

«17 ліпня. 7 г. раніцы, выехалі ў дарогу, у кірунку на м. Варняны, Астравец. Начавалі ў панскім двары Каменка. Тут багаты панскі палац, багатая мэбля, добрае скуры, чырвонаармейцы яе здзіралі, валяліся кніжкі з багатае бібліятэкі. Тут касцёл ці царква. Сяляне маліліся богу. Адносіны з сялянамі былі добрыя.

У аднэй вёсцы былі настаўнікі, якія ведаюць Кузьму... Яны пачулі прозвішча і з гэтага даведаліся, што я Кузьмоў брат. Ад іх даведаўся пра Кузьму...»

Далей у дзённіку распісаны кожны дзень — дзе бываў тады Гарэцкі. Дзякуючы гэтым запісам мы, лідчане, маем гонар за тое, што тут, на зямлі Лідскай застаецца памяць пра класіка беларускай літаратуры, жыццё якога ішло не па зайздросным шляху.

**Алесь ХІТРУН,**
**супрацоўнік літаратурнага аддзела Лідскага гісторыка-мастацкага музея (доміка В. Таўлая)**

■ Геральдычная калекцыя

## ГОНАР РАДАВОДУ

### БЕЛАРУСКІЯ ШЛЯХЕЦКІЯ ГЕРБЫ

*Вядучы рубрыкі Уладзімір КРУКОЎСКІ.*

**ГУТ ЗАЛАТЫ**

У блакітным полі — сярэбраная падкова гакамі ўніз. Над ёй — залатая васьмікутная зорка. Такія ж зоркі знаходзяцца злева і справа ад гакаў.

*Гутакоўскі.*



**ДУБАРОГ**

У блакітным полі на зялёным пагорку пень, з якога злева і справа «вырастаюць» два чорныя аленевыя рогі.

*Афанасовіч, Габрыяловіч, Габрыяновіч, Ганевіч, Ганцэвіч, Доўскурд, Туровіч.*



**ДЗЯЛОША**

У чырвоным полі чорны алені рог справа і чорнае крыло злева.

*Гінк, Даўгяла, Догель, Какуловіч, Лаўдгін, Рагальскі, Рагоўскі, Эйтмін, Эйтутовіч, Яневіч.*



**ДУБІНА**

Поле падзелена залатым пасам. У верхняй чырвонай палове тры залатыя жалуды, у ніжняй блакітнай — тры залатыя зоркі.

*Фабрыцыуш.*



■ Замкі Беларусі

# ВЯРТАННЕ БЫХАЎСКАЙ КРЭПАСЦІ

## ГОРАД БЫХАЎ АКТЫЎНА РЫХТУЕЦЦА ДА ПРАВЯДЗЕННЯ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА. ГАЛОЎНЫ АБ'ЕКТ — СТАРАЖЫТНЫ ЗАМАК

### ВЕЖА Ў НЕБА

Быхаўскі замак цяпер засыпаны снегам. Хаця над старажытнымі руінамі павеснавому ззяе яркае сонца, усё ж рэстаўратарам і археолагам, якія прыехалі з Магілёва агледзець фронт работ, даводзіцца прабівацца да пабудоў па снежных сумётах. Дзіўная працэсія, сярод якой мужчыны ў туфлях і жанчыны на абцасах, накіравалася да адной з замкавых вежаў. Галоўнае — не ўпасці ў равок з фотаапаратам.

Загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Ігар Марзалюк і старшыня Быхаўскага райвыканкама Дзмітрый Калееў фатаграфуюцца на фоне вежы. Яны называюць гэта эпахальным момантам: нарэшце пачынаецца рэстаўрацыя і рэканструкцыя Быхаўскага замка.



Кіраўнік Быхаўскага раёна Дзмітрый КАЛЕЕЎ і гісторык Ігар МАРЗАЛЮК: эпахальны момант пачатку рэстаўрацыі замка.

— Гэта наша гордасць, — падкрэслівае Дзмітрый Калееў. — Да верасня павінны быць адрэстаўраваны дзве замкавыя вежы. На свяце пісьменства тут будзе гістарычная пляцоўка, з удзелам рыцараў.

Гэтая вежа, падаецца, нядрэнна захавалася, мяркуюць спецыялісты. Акуратныя вокны-байніцы, наверсе выраслі дрэвы, праз прарэхі ў даху пераглядае сіняе неба, а на сценах маляўніча расцякліся лядовыя плямы — нібыта на чырвонай цэгле застылі хвалі. Але больш за ўсё рэстаўратары радуюцца цаглянай «елачцы» пад нагамі.

— Гэта значыць, што ўнізе ёсць падвал, і не менш за тры метры, — каментуе Ігар Марзалюк. — Можна будзе зрабіць вінтавую лесвіцу ўніз, а там стварыць цікавую экспазіцыю. Ну хаця б старажытную турму для фатаграфавання турыстаў!

### СКАРБ НЕ Ў ДЫМАХОДАХ

Быхаўскі замак — помнік архітэктуры XVII стагоддзя, які знаходзіцца на беразе Дняпра. Яго пабудаваў знакаміты палкаводзец Ян Караль Хадкевіч, а потым ім валодаў магнат Леў Сапега. Усё гэта прадстаўнікі вядомых старажытных беларускіх радоў, і замак быў іх надзейнай крэпасцю і домам.

— Быхаўскі замак — унікальны помнік мураванага дойлідства Беларусі, — расказвае Марзалюк. — Ва ўсходняй Беларусі другога такога замка няма. Па старажытнасці і захаванасці, нават нягледзячы на ўсе бядотныя рэчы, якія мы тут бачым.

Ужо ў 2000-я гады яго арандаваў прадпрымальнік па прозвішчы Сапега, што ў той час палічылі за добры знак аднаўлення старажытнага будынка. Там арганізоўвалі дрэваапрацоўчую вытворчасць, але ўсе прыватныя планы перакрэсліў у 2004 годзе пажар. Пасля гэтага руіны замка сталі закінутыя.

Самае цікавае, што пагалоскі пра таго прадпрымальніка, які нібыта не ствараў у замку сваю справу, а насамрэч шукаў скарб, знаходзяць сёння сваё пацвярджэнне. У замку ўсе дымавыя хады разбіты: відаць, шукальнікам яны падаліся найбольш прыдатным месцам для тайніка.

Цяпер у замку аконныя праёмы на ніжнім паверсе забіты дошкамі: атрымаліся такія своеасаблівыя драўляныя «жалюзі», праз якія вытанчанымі ўзорамі кладуцца промні святла на старажытныя сцены і скляпенні. Людзі (напэўна, досыць маладыя) не ведаюць жалю перад даўнінай: сцены пакрыты разнастайнымі прызнаннямі ў каханні і рэкламай сацыяльных сетак. Калі на сцяне ў змроку бачыш надпісы ва ўсю сценку «Я цябе кахаю» і «У кантакце», гэта наводзіць на думкі пра кантакт з нейкімі іншымі вымярэннямі. Калі не баяцца, можна падняцца на другі паверх па лесвіцы без страхоўкі (даху няма, і таму прыступкі засыпаны снегам), і там пабачыць тое, што засталося ад прыгожых фрэсак.

### ЖЫРАНДОЛІ САПЕГАЎ

Гэтымі днямі ў замку пачнуцца археалагічныя раскопкі. Са студэнтаў гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта створаны будаўнічы атрад з 30 добраахвотнікаў. Спачатку яны будуць працаваць ў падвалах. Мясцовая ўлада гарантавала ахову археолагам і рэчам, якія яны знойдуць.

Усе здабыткі гэтай экспедыцыі будуць прадстаўлены публіцы ў адной з вежаў на Дзень пісьменства ў верасні. У другой вежы будзе ўсталяваны макет замка, які ўвогуле мяркуецца аднавіць поўнасцю да 2018 года. Гэта прадугледжвае дзяржаўная праграма «Замкі Беларусі».

— Гэта будзе надзвычай цікавая праца, — кажа Марзалюк. — Гэта самы каштоўны і цікавы помнік гісторыі. Да мураванага замка тут стаяў замак драўляны. Непадалёк ёсць унікальныя курганныя могільнікі. Тут ужо рабілі каштоўныя знаходкі, і мы будзем праводзіць комплекснае даследаванне замка і ваколіцы.

Калі сыдзе снег і растае лёд, то ў Быхаў прыедуць геафізікі. З дапамогай сканера (як у Еўропе) яны выявяць дакладную карціну пабудоў Быхаўскага замка і таго, што ёсць у зямлі — ад жалязяк да брыльянтаў. Акрамя гэтага, захаваліся дэталёвыя планы замка, якія знайшліся ў Вільні.

Марзалюк расказвае, што будаваў замак галандскі інжынер, а падобныя збудаванні ёсць непадалёк ад Антверпена. Фотаздымкі Быхаўскага замка ў асноўным датуюцца савецкім часам, але апісанні яго ранейшага ўбрання вельмі падрабязныя.

— Мы нават ведаем, якія там былі шпалеры, — усміхаецца Ігар Марзалюк. — Не такія, як цяпер, а з атласу і шоўку, з дэкаратыўнымі пазалочанымі цвікамі для абіўкі. Крышталёвыя свяцільні, каваныя жырандолі. Карцінная галерэя. Вельмі прыгожы быў палац. А над уваходнай брамай «лунаў» герб Сапегаў «Ліс».

Гэтую ўваходную браму (а дакладней, яе магутны падмурак) археолагі хочуць раскапаць, закансерваваць і зрабіць часткай музея. А яшчэ Ігар Марзалюк марыць пра тое, каб знайсці старажытныя гарматы: паводле гістарычных звестак, у Быхаўскім замку быў унікальны арсенал зброі, з гербамі і дэвізам каралёў Рэчы Паспалітай.

— Мы закранаем XVII стагоддзе, і гэта захапляльна, — сказала дырэктар цэнтра па рэстаўрацыі ў Магілёве Наталля Кузняцова. — Мы хочам аднавіць замак у першапачатковым выглядзе. Вядома, не абысціся без ужывання новых матэрыялаў, але, па крайняй меры, трэба максімальна захаваць даўніну. Аднавіць замак з руінаў цалкам рэальна, толькі давядзецца прыкласці вялікія высілкі — фінансавыя і фізічныя.



План Быхаўскага замка.

### ЗДАРОВЫ ДУХ

У Быхаве займаюцца не толькі замкам. У горадзе наводзяць парадак. Будынкі на цэнтральнай вуліцы Леніна пафарбаваны ў прыгожыя колеры, буйныя крамы мяняюць сваё аблічча з архаічнага на сучаснае.

— Горад чакаюць кардынальныя змяненні, — абяцае кіраўнік Быхаўскага раёна Дзмітрый Калееў. — Нягледзячы на спазненне вясны, работы актыўна вядуцца. Дзень пісьменства сёлета будзе юбілейны, 20-ты. Мы чакаем у госці больш за 50 тысяч чалавек. І прыкладзём усе сілы, каб дастойна правесці свята.

Спіс аб'ектаў, якія трэба адрамантаваць, немалы. Напрыклад, гарадскі кінатэатр «Радзіма», якому сёлета споўніцца 100 (!) гадоў, будзе мадэрнізаваны: новае абсталяванне дазволіць глядзець стужкі ў 3D і з якасным гукам, для гледачоў зробяць кавярню і ўсе сучасныя выгоды.

У Быхаве таксама адрамантуюць і прывядуць у парадак раённы Дом культуры, чыгуначны і аўтамабільны вакзалы (разам з прывакзальнай плошчай), краязнаўчы музей, а таксама зробяць дзіцячы парк. Дзеля дзіцячага парку быхаўчане гатовы выходзіць на суботнікі (і адзін ужо адбыўся).

Адзін з важных аб'ектаў у праграме навядзення парадку ў Быхаве не звязаны непасрэдна са святам пісьменства. Хаця — у здаровым целе здаровы дух, нагадвае мясцовае кіраўніцтва і раіць глядзець шырэй. Гэта басейн у фізкультурна-аздараўленчым цэнтры на тэрыторыі былога ваеннага гарадка. Ён шмат гадоў стаяў закінуты, яго нават хацелі засыпаць, але неўзабаве там будзе новае тэхналагічнае абсталяванне.

— Душа радуецца, — шчыра сказаў дырэктар цэнтра Аляксандр Яшчанка. — Аднаўлення басейна людзі чакалі даўно. Гэта добрая ідэя.

У Быхаве адкрыты і штодзённа папаўняюцца дабрачынныя рахункі. Напрыклад, на рэстаўрацыю знакамітай сінагогі, якую гісторыкі называюць унікальнай. Ёсць надзея, што ў аднаўленні сінагогі будуць браць удзел не толькі грамадзяне Беларусі, але і яўрэі з замежжа. Тым больш што тут плануюць стварыць музей беларускага яўрэйства.

— Я думаю, што Быхаву вельмі рэальна стаць малой турыстычнай «меккай», — лічыць кіраўнік Быхаўскага раёна. — Таму што наш раён — лідар у Магілёўскай вобласці па аграэкатурызме. Бог нашу зямлю не пакрыўдзіў, і гасцей у нас будзе ўсё больш. А пакуль запрашаем на Дзень пісьменства.



Снег на зямлі і сонца ў небе.

**Ілона ІВАНОВА.**
**Фота аўтара.**

*г. Быхаў*

Кулінарная Энцыклапедыя Мікалая Нікіфароўскага

# КАЛІ ЁСЦЬ САЛА, ТО І ГРЫБ ПАТРАВА

*Грыбы — гэта прыгажосць,*
*якая ў час грыбнога надвор'я*
*промнямі сонца*
*выціскаецца з зямлі,*
*як зубная паста з цюбіка.*
**Віктар Шніп**

Стравы з грыбоў Мікалай Нікіфароўскі адносіў да выпадковых, хаця беларускую кулінарыю, наогул, цяжка ўявіць сабе без грыбоў; а ў кожнай запаслівай гаспадыні ў любую пару года заўсёды знойдуцца і сушаныя баравічкі, і салёныя апенькі. Пачатак выкарыстання грыбоў у харчовым рацыёне чалавека адносіцца аж да каменнага веку, калі адной з формаў гаспадарчай дзейнасці людзей было збіральніцтва. Шляхам спроб і памылак, сярод якіх былі і смяротныя, чалавек навучыўся адрозніваць грыбы, прыдатныя для ежы, ад ядавітых. Шырока выкарыстоўваліся гэтыя лясныя прыгажуны ў магіі, замовах і народнай медыцыне. Сведчаннем значнай ролі грыбоў у міфалогіі і культуры можна лічыць узнікненне асобнай навукі — этнамікалогіі. У розных культур стаўленне да грыбоў было супрацьлеглым: ад іх грэчаскай назвы як «ежы багоў» да трактавання грыбоў як «хлеба д'ябла» ў традыцыях іншых народаў. На думку У. М. Тапарова, грыбы ўключаюцца ў трыяду «жыццё — смерць — урадлівасць», якая дубліруецца прасторавымі перамяшчэннямі аб'екта міфа.

Паводле народнага тлумачэння, сваім паходжаннем грыбы абавязаны персанажам хрысціянскай традыцыі. Некалі даўно, калі Хрыстос з Пятром хадзілі па зямлі і Пятро насіў у торбачцы пасілак, адбылося наступнае: галодны Пятро цішком адламаў кавалак хлеба і паклаў у рот. Але не паспеў праглынуць, як да яго звярнуўся Хрыстос з пытаннем, што яшчэ добрае для людзей можна зрабіць. Збянтэжаны Пятро выплюнуў той хлеб, і з яго пайшлі расці грыбы.

У еўрапейскіх лясах расце больш за дзве сотні прыдатных для ежы грыбоў, але мы з вамі выкарыстоўваем не больш за дваццаць. Цікава, што ў харчовых традыцыях нават еўрапейскіх народаў стаўленне да грыбоў рознае. Англічане дык наогул усе грыбы лічаць паганымі, акрамя шампіньёнаў. А ў славянскіх народаў грыбы з'яўляюцца далікатэсам. Чаму нам так падабаецца іх смак? Ды таму, што грыбы змяшчаюць энзімы — пахкія экстрактыўныя рэчывы, якія павышаюць апетыт і спрыяюць лепшаму засвойванню ежы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Цяжка знайсці лепшы адпачынак, чым «ціхае паляванне». Гэта яднанне з прыродай, бальзам для душы і назапашванне станоўчых эмоцый. А калі дадаць, што булён з сушаных баравікоў у тры разы больш каларыйны за мясны, а кілаграм тых жа баравікоў замяняе тры кілаграмы мяса або рыбы, то ў «трэцім паляванні» ёсць і спажывецкі інтарэс.

Для беларускіх сялян было б вельмі цяжка вытрываць чатыры гадавыя пасты без грыбоў. Дапамагалі яны чалавеку і ў часы голаду, войнаў і эпідэмій. Падчас Вялікай Айчыннай вайны самалёты разам з боепрыпасамі і медыкаментамі скідвалі партызанам лістоўкі з тэкстам «Якую ежу можна знайсці ў лесе» вядомага рускага батаніка і грыбніка Дзмітрыя Паўлавіча Зуева.

Нікіфароўскі піша, што мясцовая кухня карыстаецца грыбамі ў наступных выпадках:

а) у грыбной «юшцы», калі грыбоў мала, а трэба накарміць вялікую сям'ю. Тады трэба прыкласці пэўныя намаганні, каб вылавіць лыжкай з «юшкі» хаця б некалькі грыбкоў, якія дадаюцца туды хутчэй для смаку, чым для наедку;

б) у «тушонцы». Калі грыбоў дастаткова, то імі набіваюць гаршчок, соляць, ставяць у выпаленую печ, а калі яны пусцяць сок і ўварацца, то дадаюць яшчэ адну порцыю. Хаця мне здаецца, што «грыбная тушонка» часцей рабілася з бульбай, капустай або іншай гароднінай, а ў скаромныя дні кавалак мяса або сала таксама вельмі пасаваў да грыбоў;

в) у выглядзе «дабавы», калі сыры або сушаны грыб кладзецца ў тую ці іншую посную «страву». У гэтым выпадку сушаны грыб іншы раз таўчэцца ў парашок або дробна крышыцца.

Мікалай Якаўлевіч піша, што смажаныя на патэльні грыбы не часта можна сустрэць на сялянскім стале. Чаму, спытаецеся вы? Ды таму, што такое прыгатаванне патрабавала значнай колькасці алею, які трэба было купіць, а грошы ў простага люду вадзіліся рэдка.

У «юшцы» і «тушонцы» выкарыстоўваліся ўсе ядомыя грыбы, а вось баравікі, «казлы і махавікі» сушыліся, каб потым выкарыстаць іх падчас посту. Да «казлоў» Нікіфароўскі адносіў маслякі і казлякі, а «махавіком» называў ядомы грыб на тонкай ножцы з жоўта-бурай шапкай. Пры адсутнасці вышэйназваных грыбоў сяляне сушылі і чорны грыб, вядомы на Віцебшчыне пад назвай «абабак» (бабка, падбярозавік).

Нікіфароўскі сцвярджае, што марынаванне і засолку грыбоў мясцовыя сяляне не практыкавалі, толькі зрэдку на іх стале можна было сустрэць мачоныя грузды і ваўнянкі, якія амаль ніколі не дажывалі да каляднага посту і псаваліся з-за малой колькасці солі.

Вараныя грыбы пры падачы да стала моцна саліліся, прыпраўляліся цыбуляй, а ў святочных выпадках — яшчэ і перцам. У скаромныя дні можна было пакласці ў страву лыжку смятаны або кавалачак масла.

У наш час можна вырошчваць грыбы на прысядзібным участку. Два гады таму я купіў на сельскагаспадарчай выставе драўляныя палачкі з міцэліяй японскага грыба шыітаке, «пасадзіў» іх у стары бярозавы пень і забыўся пра гэта. Прайшло два гады. Летась у канцы кастрычніка я прыехаў у вёску, каб падрыхтаваць бацькоўскую хату да зімы, выпадкова зазірнуў у палісаднік да старога пня і... ледзь не абамлеў ад здзіўлення: ён быў усыпаны прыгожымі грыбамі ў цёмна-карычневых капялюшыках. Гэта былі знакамітыя грыбы шыітаке, якія ўжо больш за тысячу гадоў выкарыстоўваюцца ў кулінарыі народаў Кітая, Японіі, Карэі і народнай медыцыне для прафілактыкі анкалагічных захворванняў, павышэння жыццёвай сілы цы і запавольвання працэсу старэння. Смак у грыбоў аказаўся цудоўным, і цяпер я чакаю вясны, каб пасадзіць гэты далікатэс ва ўсіх зручных для вырошчвання шыітаке месцах.

**Аляксандр ВАШЧАНКА.**

**P. S.** *З размовы дзвюх жанчын у сеціве:*

*— Ці праўда, што калі мухаморы адварыць у некалькіх водах, то іх можна есці? І што асабліва карысныя яны для мужчын?*

*— Мухаморы трэба варыць у кіпені 5 хвілін, чатыры разы зліваючы ваду. Потым іх можна гатаваць як звычайныя грыбы. Гэта для жанчын. Мужчын можна карміць мухаморамі адразу: іх, казлоў, і так зашмат развялося.*

### КАРАЛЕЎСКІЯ АПЕНЬКІ Ў СМЯТАНЕ

У нас на Віцебшчыне познія апенькі з тоўстымі мясістымі ножкамі называюць «каралеўскімі». Яны лічацца самымі смачнымі. ***Нам спатрэбіцца:*** *1 кг свежых апенек (у зімовы час можна выкарыстаць замарожаныя), 1 цыбуліна, 100 мл алею, 100 г смятаны, зеляніна кропу і пятрушкі, соль і перац на смак.*

Перабраныя, памытыя і парэзаныя грыбы варым паўгадзіны ў падсоленым кіпені, здымаючы пену. Адкідваем іх на друшляк і даём сцекчы вадзе. Глыбокую патэльню ставім на агонь, наліваем алей, засыпаем грыбы і смажым 10 хвілін, дадаем дробна парэзаную цыбулю, соль і перац (на смак) і смажым яшчэ 15 хвілін. Потым дадаем смятану, пасыпаем дробна парэзанай зелянінай, закрываем накрыўкай, памяншаем агонь і гатуем яшчэ 5 хвілін. Да стала пададзім з адваранай бульбай.

Рэцэпт пад назвай **«качка, надзяваная з блінамі»**, які ў яе сям'і перадаецца ўжо ў трэцім пакаленні і з'яўляецца традыцыйным на святочным стале, даслала нам Станіслава Іосіфаўна Сурдо з Мінска. Яна піша, што для стравы патрэбны наступныя інгрэдыенты: качка сярэдніх памераў (прыблізна 2 кг), 1 кг курыных сардэчак або страўнікаў, 3 вялікія цыбуліны, 3 яйкі, соль, перац. Тушку качкі старанна мыем, высушваем сурвэткай, націраем звонку і знутры соллю, чорным молатым перцам і на 1 гадзіну ставім у халадзільнік. Курыныя сардэчкі ці страўнікі адварваем і прапускаем праз мясарэзку. На малацэ, яйках і пшанічнай муцэ выпякаем наліснікі — тонкія бліны (12-15). Кожны блін рэжам уздоўж на тры часткі, складваем і ўпоперак наразаем саломкай. Цыбулю дробна наразаем і падсмажваем. Перамешваем парэзаныя бліны з сардэчкамі, цыбуляй, убіваем тры яйкі, солім, перчым. Пакідаем крыху курынага бялка і змазваем ім качку знутры, каб начынне лепш прыліпала. Шчыльна набіваем гэтай сумессю качку і зашываем. На шывок накладваем заплату з марлі. На бляху кладзём драўляныя рэечкі, на іх — качку і ставім у духоўку пры тэмпературы 220° на 15 хвілін. Потым тэмпературу памяншаем да 180° і гатуем 2 гадзіны. Здымаем марлю і ніткі. Да стала пададзім у халодным выглядзе.



**Белгазпромбанк**
*Энергия твоего будущего!*

## Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

**Адрес размещения годового отчета:** http://www.belgazprombank.by/about/finansovie_pokazateli/godovie_buhgalterskie_otcheti_po_formam/godovoj_bo_2012/

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5 | 337 567,0 | 296 410,6 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 14 967,0 | 25 913,1 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 | 1 886 206,6 | 1 195 148,0 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7, 32 | 1 124 101,6 | 1 021 510,7 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 8, 32 | 958 439,8 | 702 195,1 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 9, 32 | 5 299 508,6 | 3 691 978,7 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 659 824,5 | 601 978,8 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 10 | 147,6 | 45,9 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 | 336 122,8 | 202 311,5 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 229,4 | 879,4 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 12 | 126 174,3 | 102 219,7 |
| 13 | **ИТОГО активы** | **11** | | **10 743 289,2** | **7 840 591,5** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 13 | 318 794,2 | 315 507,3 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 14, 32 | 1 866 022,9 | 2 139 304,9 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 15, 32 | 6 063 133,0 | 4 205 046,7 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 16 | 355 713,4 | 271 251,7 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 564,0 | - |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 17 | 133 833,6 | 72 750,9 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 8 738 061,1 | 7 003 861,5 |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 18 | 1 252 268,8 | 426 268,8 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 19 | 77 626,8 | 27 564,5 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 20 | 176 490,4 | 108 595,4 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 21 | 498 842,1 | 274 301,3 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | | 2 005 228,1 | 836 730,0 |
| 29 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **10 743 289,2** | **7 840 591,5** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 164 130,3 | 641 417,9 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 657 201,0 | 348 091,7 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | 23, 32 | 506 929,3 | 293 326,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 239 700,7 | 152 690,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 82 060,8 | 79 817,7 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | 24, 32 | 157 639,9 | 72 873,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 30 605,8 | (80 365,3) |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 25 | 59 800,7 | (8 809,4) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 26 | 64 347,6 | (259 778,8) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 27 | 108 637,3 | 516 904,6 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 28 | 230 191,9 | 185 765,1 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 29 | 52 120,5 | 28 443,0 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 30,32 | 295 863,0 | 148 930,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 31 | 64 497,1 | 28 112,6 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 389 529,1 | 199 785,5 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 48 176,3 | 32 911,2 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **341 352,8** | **166 874,3** |
| 18 | **Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях** | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 33 | 0,44 | 0,39 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

### ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| 1 | **Остаток на 1 января 2011 г.** | **3011** | **426 268,8** | **-** | **23 015,6** | **148 367,3** | **22 132,5** | **619 784,2** |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей капитала | 3012 | - | - | 4 548,9 | 125 934,0 | 86 462,9 | 216 945,8 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 166 874,3 | 86 462,9 | 253 337,2 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 4 548,9 | (4 548,9) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | (27 293,6) | x | (27 293,6) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (27 293,6) | x | (27 293,6) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (9 097,8) | - | (9 097,8) |
| 3 | **Остаток на 1 января 2012 г.** | **3013** | **426 268,8** | **-** | **27 564,5** | **274 301,3** | **108 595, 4** | **836 730,0** |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| 4 | **Остаток на 1 января 2012 г.** | **3011** | **426 268,8** | **-** | **27 564,5** | **274 301,3** | **108 595, 4** | **836 730,0** |
| 5 | Изменения статей капитала | 3012 | 826 000,0 | - | 50 062,3 | 224 540,8 | 67 895,0 | 1 168 498,1 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 341 352,8 | 67 895,0 | 409 247,8 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 50 062,3 | (50 062,3) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | 826 000,0 | - | x | (50 062,3) | x | 775 937,7 |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | 826 000,0 | - | x | x | x | 826 000,0 |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (50 062,3) | x | (50 062,3) |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями капитала | 30125 | - | - | - | - | - | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (16 687,4) | - | (16 687,4) |
| 6 | **Остаток на 1 января 2013 г.** | **3013** | **1 252 268,8** | **-** | **77 626,8** | **498 842,1** | **176 490,4** | **2 005 228,1** |

### СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 341 352,8 | 166 874,3 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | 20 | 67 895,0 | 86 462,9 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств | 3012121 | | 67 895,0 | 86 462,9 |
| 2.2 | переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | - | - |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| 3 | **ИТОГО совокупный доход** | **30121** | | **409 247,8** | **253 337,2** |

### ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2012 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2012 год | 2011 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 1 169 110,9 | 594 882,3 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | ( 652 203,9) | (346 738,0) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 239 969,0 | 149 318,7 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (79 578,1) | (75 768,0) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 30 605,8 | (80 365,3) |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 5 298,2 | (2 385,7) |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 54 086,0 | (285 195,9) |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 51 354,1 | (58 963,7) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 32 377,8 | 21 214,2 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (324 830,8) | (162 722,3) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (37 305,0) | (31 903,1) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 488 884,0 | (278 626,8) |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (35 837,3) | (149 764,3) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (218 397,4) | (187 582,0) |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (182 711,6) | 28,8 |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (1 766 065,3) | (625 450,5) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (79 961,0) | (24 904,6) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (2 282 972,6) | (987 672,6) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | (1 881,3) | 118 649,6 |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | (276 908,7) | 676 336,6 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 1 637 815,4 | 1 412 545,9 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | 69 528,2 | (282 593,2) |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 69 882,9 | 3 993,3 |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 1 498 436,5 | 1 928 932,2 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | (295 652,1) | 662 632,8 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (56 742,3) | (25 905,1) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 19 306,2 | 4 032,7 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (37 436,1) | (21 872,4) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | 826 000,0 | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | (50 062,3) | (27 293,6) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | 775 937,7 | (27 293,6) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 45 463,0 | 402 237,4 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 488 312,5 | 1 015 704,2 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 6 | X | 1 270 110,8 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 1 758 423,3 | X |

**Председатель правления** **В.Д. Бабарико**

**Главный бухгалтер** **Т.М. Пивовар**

**Дата подписания: 25 января 2013 г.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 27.10.2006, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.*

Достоверность бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств подтверждена.

**Директор АООО «Аудитэл»** **А.И. Папковский**

## Аудиторское общество с ограниченной ответственностью

220090, г. Минск,
Логойский тракт, 22а, пом. 46, к. 410
тел./факс 268 52 96, тел. 268 52 97,
268 52 98 e-mail: auditel@mail.ru

**Аудитэл**

р/с 3012007218011
в «Приорбанк» ОАО
ЦБУ 100 г. Минск, код 749
УНП 100591487

**Исх.5**
**25 января 2013г.**

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
### по годовой финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» за период с 01 января по 31 декабря 2012 года

***Председателю Правления ОАО «Белгазпромбанк»***
***Бабарико В.Д.***

**Аудируемое лицо:**

Открытое акционерное общество «Белгазпромбанк»;

место нахождения (юридический адрес): 220121, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2;

сведения о государственной регистрации: ОАО «Белгазпромбанк» зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28.11.1997, регистрационный номер 16; УНП 100429079

**Аудиторская организация:**

Аудиторское общество с ограниченной ответственностью «Аудитэл»;

место нахождения (юридический адрес): 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22а, пом. 46, к. 410;

сведения о государственной регистрации: АООО «Аудитэл» имеет свидетельство о государственной регистрации коммерческой организации, выданное Минским городским исполнительным комитетом решением от 28 сентября 2000 г. № 1097;

УНП 100591487

Мы провели аудит прилагаемой годовой финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк», состоящей из:

бухгалтерского баланса на 01.01.2013;

отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств с 01 января по 31 декабря 2012 года; пояснительной записки за 2012 год;

форм пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности».

Руководство ОАО «Белгазпромбанк» несет ответственность за подготовку и представление годовой финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверности годовой финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной годовой финансовой отчетности и соответствии совершенных ОАО «Белгазпромбанк» банковских и иных операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» и республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной годовой финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытие информации в годовой финансовой отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ОАО «Белгазпромбанк» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а также для выражения мнения относительно состояния внутреннего контроля.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления годовой финансовой отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

